16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 24 (5181) 17 чэрвеня 2022 г. ISSN 0024-4686

Віцебшчыне ёсць што паказаць стар. 4

Духмянай паэзіі слоік стар. 6



Свет, які стварыў Шагал стар. 13

Хвалі музыкі, рыфмы натхнення

Фота Лізаветы Голад.

У фестывальным Маладзечна.

Атмасфера свята і добрага настрою панавала падчас XXI Нацыянальнага фестывалю беларускай паэзіі і песні «Маладзечна-2022», прымеркаванага да Года гістарычнай памяці і 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа.

Гасцей і ўдзельнікаў мерапрыемства шчыра сустракалі апладысментамі. На сцэну выходзілі народны артыст Беларусі Мікалай Скорыкаў, заслужаныя артысткі Вікторыя Алешка, Ірына Дарафеева, Наталля Тамэла, Беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры». Гучалі спевы, вершы, жарты, добрыя пажаданні, хвалямі натхнення лілася мілагучная музыка. «XXI — адлік новага часу. Пачатак» — пад такой назвай адбыўся канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі.

Надведвальнікі мелі магчымасць здзейсніць падарожжа ў часе па родным краі: наведаць паселішча першабытнага чалавека, зазірнуць у Сярэднявечча, адчуць сябе званым госцем у велікасвецкім палацы — стылізаваныя пляцоўкі ўпрыгожылі галоўную вуліцу Маладзечна. Завяршылася падзея адкрыццём маладзёжнай крэатыўнай прасторы «ФэстМ».

Працяг тэмы на стар. 2 ▸

«ЛіМ»-акцэнты

Памяць. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка накіраваў прывітанне ўдзельнікам міжнароднай парламенцкай канферэнцыі «Гістарычная памяць: Вялікая Перамога, здабытая адзінствам». «Мы, наследнікі пераможцаў — азербайджанцы і малдаване, беларусы і грузіны, армяне і казахі, украінцы і кіргізы, рускія і ўзбекі, таджыкі і туркмены, прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцей некалі адзінай краіны, адстаялі ў Вялікай Айчыннай вайне права на жыццё, свабоду і чалавечую годнасць, — гаворыцца ў прывітанні. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што для беларусаў, якія страцілі ў той вайне кожнага трэцяга жыхара, усенародны подзвіг з'яўляецца неад'емнай часткай нацыянальнай ідэі. «Упэўнены, што разам мы захаваем агульную гістарычную мінуўшчыну, не дазволім забраць у нас Перамогу, здабытую адзінствам, бяспрыкладнай мужнасцю і крывёй салдат, партызан, падпольшчыкаў і многіх простых людзей, перададзім праўду будучым пакаленням», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Свята. Новае свята — Дзень бацькі — устаноўлена ў Беларусі 21 кастрычніка. Адпаведны Указ № 198 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Дакументам унесена змяненне ва Указ № 157 ад 26 сакавіка 1998 года «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь». Ініцыятыва аб заснаванні Дня бацькі прагучала ў час звароту Прэзідэнта з Пасланнем да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 28 студзеня. Кіраўнік дзяржавы ідэю падтрымаў і даручыў ураду распрацаваць адпаведны дакумент. Дата 21 кастрычніка была выбрана для святкавання Дня бацькі, паколькі ў Беларусі склалася шматгадовая традыцыя адзначаць 14 кастрычніка Дзень маці, і цяпер з'явіцца магчымасць з 14 да 21 кастрычніка праводзіць бацькоўскі тыдзень. Рэалізацыя ў гэты перыяд адпаведных мерапрыемстваў будзе садзейнічаць далейшаму захаванню традыцыйных сямейных каштоўнасцей, павысіць значнасць сямейнай палітыкі, якая праводзіцца дзяржавай.

Вернісаж. У Міністэрстве замежных спраў Беларусі адкрылася фотавыстаўка да 30-годдзя ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Расіяй. Адкрываючы фотапраект, міністр замежных спраў Уладзімір Макей адзначыў, што экспазіцыя, падрыхтаваная МЗС сумесна з інфармацыйным агенцтвам *Sputnik*, — толькі першы крок у серыі святочных мерапрыемстваў у Мінску і Маскве. «Гэта знакавая дата ў гісторыі нашых стасункаў, — падкрэсліў Уладзімір Макей. — Знакавая не толькі з пункту гледжання сімвалізму лічбаў, але і з пункту гледжання рэальных спраў, падзей і дасягненняў. Можна канстатаваць, што мы падышлі да гэтай даты з вялізным багажом назапашанага вопыту і супрацоўніцтва ў абсалютна розных сферах. 30 гадоў з пункту гледжання гісторыі — тэрмін кароткі, але гэтыя 30 гадоў супрацоўніцтва ствараліся не на пустым месцы».

Музеі. «Быкаўскія дні — 2022» у музеі-дачы Васіля Быкава (філіял Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры) пад Мінскам пройдуць з 19 да 22 чэрвеня. Анансуецца, што дні памяці народнага пісьменніка Беларусі адбудуцца ў фармаце літаратурна-мастацкага пленэру. Вынікам калектыўнай творчасці гасцей стане эксклюзіўная мастацкая кніга ручной работы «Дзень нараджэння пісьменніка» з вокладкай і ілюстрацыямі. Выданне стане сімвалічным падарункам вядомаму земляку да дня нараджэння і можа заняць дастойнае месца ў экспазіцыі. «Дадатковае натхненне і імпульс да творчасці госці музея-дачы змогуць атрымаць у галерэі архіўных фотаздымкаў вядомага беларускага фотамастака Яўгена Коктыша, спецыяльна адабраных да гэтых дзён з фондаў Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры. Цудоўныя мастацкія фотакарткі — своеасаблівая бліц-хроніка жыцця і творчасці Васіля Быкава», — падкрэслілі арганізатары.

Рэгіёны. У Паставах адкрылі алею заснавальнікаў фестывалю «Звіняць цымбалы і гармонік», інфармуе «СБ. Беларусь сегодня». Над распрацоўкай канцэпцыі працавалі мінскія скульптары Аляксандр Фінскі і Андрэй Суднік. У 1992 годзе фестываль упершыню прынялі Паставы: да гэтага свята музыкі па разе праходзіла ў Магілёве і Віцебску. Пасля чаго Міністэрства культуры прапанавала даць фестывалю пастаянную прапіску ў Паставах. Горад падтрымаў ідэю і сёлета сустракаў музыкантаў і народныя калектывы ўжо трыццаты раз. «Мы з удзячнасцю згадваем выдатных музыкантаў і грамадскіх дзеячаў, якія стаялі каля вытокаў фестывалю, усіх тых, хто доўгія гады ўмацоўваў яго прэстыж і аўтарытэт, — нагадаў старшыня Пастаўскага райвыканкама Сяргей Чэпік. — Гэта народныя артысты Беларусі Міхаіл Казінец і Міхаіл Дрынеўскі, заслужаныя дзеячы культуры Уладзімір Гром і Уладзімір Таран, лаўрэат міжнародных конкурсаў Мірон Була і многія іншыя арганізатары фестывалю».

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

Ва ўніверсітэцкіх аўдыторыях

Прайшла рабочая сустрэча рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта доктара педагагічных навук Андрэя Караля і старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктара — галоўнага рэдактара Выдавецкага дома «Звязда» Аляксандра Карлюкевіча.

Размова ішла пра супрацоўніцтва пісьменніцкай грамадскасці са студэнцкай моладдзю, формы і метады, якія паспрыяюць большай грамадзянскай актыўнасці творчай моладзі. Суразмоўцы дамовіліся аб правядзенні цэлага шэрагу мерапрыемстваў на розных пляцоўках Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Паэты, празаікі, публіцысты краіны гатовы актыўна прыходзіць у студэнцкія аўдыторыі, выступаць не толькі з расповедам пра ўласныя творчыя здабыткі, але і дзяліцца жыццёвым, грамадскім вопытам.

Старшыня СПБ Аляксандр Карлюкевіч вылучыў некалькі ініцыятыў, звязаных з пашырэннем вядомасці пра найболей важкія спецыяльнасці ўніверсітэта, агучыў гатоўнасць літаратараў падрыхтаваць мастацка-дакументальныя кнігі пра БДУ.

Сяргей ШЫЧКО

Плённае супрацоўніцтва

Усерасійскае свята «Крыніца паэзіі тваёй…», прысвечанае Фёдару Цютчаву, адбылося ў Оўстугу Бранскай вобласці. Яго наведалі старшыня Віцебскага абласнога аддзялення СПБ, лаўрэат Усерасійскай прэміі імя Ф. І. Цютчава, уладальнік Залатога медаля і Ганаровага знака «Тютчевъ» Тамара Краснова-Гусачэнка і член творчай суполкі, кіраўнік народнага клуба «Ветэран» Полацкай гарадской арганізацыі ветэранаў Лідзія Піскун.

Свята пачалося з ліцеі ў памяць аб паэце. На ўрачыстым адкрыцці перад удзельнікамі свята выступілі в. а. намесніка губернатара Бранскай вобласці Алена Ягорава, старшыня абласной пісьменніцкай арганізацыі Бранска празаік Віктар Рэшатнёў і іншыя ганаровыя госці. Яркай паэтычнай нотай стала выступленне, у якім прагучалі новыя вершы Тамары Красновай-Гусачэнкі, віцяблянкі, але ўраджэнкі Бранскай вобласці.

Галоўнай дзеяй свята было ўручэнне прэміі імя Ф. І. Цютчава «Рускі шлях», лаўрэатам якой у 2022 годзе стаў празаік, старшыня Гомельскага абласнога адзялення СПБ Уладзімір Гаўрыловіч. Віцебскія пісьменнікі падарылі Бранскай абласной бібліятэцы імя Ф. І. Цютчава кнігі пісьменнікаў Віцебшчыны з аўтографамі і ўручылі ганаровую грамату Саюза пісьменнікаў Беларусі Бранскай пісьменніцкай арганізацыі за шматгадовае плённае супрацоўніцтва.

Таццяна ІВАНОВА

Шляхамі сяброўства

Саюз пісьменнікаў прыняў актыўны ўдзел у мерапрыемствах XXI Нацыянальнага фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне. Асноўныя імпрэзы з удзелам літаратараў адбыліся на другі дзень фэсту. У пісьменніцкую дэлегацыю пад кіраўніцтвам першага намесніка старшыні СПБ Алены Стэльмах увайшлі паэты з розных рэгіёнаў Беларусі.

Фота Васіля Купкова.

Падчас сустрэчы паэтаў і кампазітараў.

Найбольш прадстаўнічай была група Мінскага гарадскога аддзялення на чале з яго старшынёй Міхасём Пазняковым. Брэсцкую групу ўзначальвала старшыня абласнога аддзялення Таццяна Дземідовіч, дэлегацыю Гродзеншчыны — старшыня абласнога аддзялення Людміла Кебіч, Міншчыну прадстаўлялі літаратары пад кіраўніцтвам намесніка старшыні абласнога аддзялення Ірыны Карнаухавай, Магілёўшчыну — паэтэса Алена Кісель. Да іх далучыліся і кампазітары Алег Елісеенкаў, Аліна Безенсон, Віктар Кісцень і іншыя.

Па традыцыі дэлегацыя СПБ завітала па дарозе на малую радзіму Янкі Купалы ў Вязынку. Тут гасцей з хлебам-соллю сустракалі прадстаўнікі кіраўніцтва Маладзечанскага раёна і шматлікія прыхільнікі паэзіі і песні. Перад помнікам Янку Купалу адбылося свята, якое вёў краязнаўца і гісторык Міхась Казлоўскі.

Пасля ў раённай бібліятэцы імя Максіма Багдановіча прайшла прэзентацыя Рэспубліканскага мастацка-патрыятычнага праекта і фотапаэтычных кніг «Зачараваны Беларуссю», «Бачу Беларусь такой», «Мая Радзіма», «Навасады: малая Радзіма». Яе правялі аўтары праекта Уладзіслаў Цыдзік і Алена Стэльмах. Выступілі тут і паэты Кацярына Роўда, Алена Басікірская, Таццяна Яцук, песні на свае вершы выканалі Людміла Кебіч і Кастусь Цыбульскі.

Свята прадоўжылася ў малой зале Палаца культуры. Паэтычна-музычную гасцёўню «Паэтычная спадчына — нашчадкам запавет» тут правялі Міхась Пазнякоў і Алена Стэльмах. Прагучалі вершы ў аўтарскім выкананні Віктара Шніпа, Валерыя Максімовіча, Іны Фраловай, Таццяны Дземідовіч... Песні на творы Івана Юркіна і Уладзіміра Мазго выканаў заслужаны дзеяч мастацтваў Алег Елісеенкаў. Выступіла таксама вакальная група народнага хору «Світанак» Маладзечанскіх энергасетак.

Заключным мерапрыемствам фестывальнага дня стала творчая сустрэча паэтаў з членамі Саюза кампазітараў. Правялі яе Алена Стэльмах і Міхась Пазнякоў, а таксама кампазітар Аліна Безенсон. Удзельнікі падзяліліся вопытам супрацоўніцтва, вызначылі шляхі далейшага творчага сяброўства. Успомнілі і паэтаў, якія, на вялікі жаль, адышлі ў вечнасць, але былі актыўнымі ўдзельнікамі паэтычна-песенных свят, у тым ліку і Нацыянальнага фестывалю ў Маладзечне. Аб дзейнасці народнага клуба паэтаў і музыкантаў «Жывіца» распавяла яго кіраўнік Ірына Карнаухава.

Павел КУЗЬМІЧ

імпрэзы

На паклон да Купалы

Працягласт творчае супрацоўніцтва звязвае СШ № 134 г. Мінска і сталічнае аддзяленне СПБ. У навучальнай установе адбываюцца сустрэчы з пісьменнікамі, а таксама артыстамі Тэатра паэзіі МГА СПБ. Вучні пастаянна ўдзельнічаюць у літаратурных конкурсах, імпрэзах, якія праводзіць аддзяленне ў самых розных установах культуры і адукацыі.

На гэты раз свята было наладжана ў Вязынцы — на малой радзіме Янкі Купалы, 140-годдзе з дня нараджэння якога шырока святкуецца.

Удзельнікамі падарожжа ў Вязынку сталі навучэнцы 3 «А» класа, бацькі і настаўнікі. Дарэчы, у гэтым класе вучыцца і юны артыст Тэатра паэзіі, неаднаразовы пераможца гарадскога конкурсу чытальнікаў паэзіі Роберт Багушыньскі. Госці ўсклалі кветкі да помніка Янку Купалу. Перад імі выступіў старшыня сталічнага аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў, які расказаў пра значэнне і ролю паэта ў развіцці нацыянальнай літаратуры, адказаў на пытанні цікаўных хлопчыкаў і дзяўчынак. Гучалі вершы пра мову, Радзіму, стваральную працу. Затым усе наведалі філіял музея Янкі Купалы, пазнаёміліся з тэрыторыяй мемарыяльнага комплексу.

Свята прадоўжылася на беразе ракі Вязынкі. Тут дзеці ўзялі ўдзел у займальнай літаратурнай віктарыне. Зноў гучалі вершы і песні. Да падрыхтоўкі і правядзення незабыўнага літаратурнага падарожжа далучылася мастацкі кіраўнік Тэатра паэзіі Вольга Багушыньска.

Міхась ЖУРАВІНА

дарэчы

Сустрэчы з пагранічнікамі

У Год гістарычнай памяці брэсцкія аўтары праводзяць шэраг сустрэч з пагранічнікамі. Ініцыятарамі выступаюць Брэсцкая Чырванасцяжная пагранічная група імя Ф. Э. Дзяржынскага і Пінскі пагранічны атрад.

Творчыя сустрэчы ў клубе пагранічнай групы і ў цэнтры інжынернага забеспячэння правёў краязнаўца Анатоль Бензярук. Найперш размова тычылася лёсу Драмлёва — вогненнай вёскі, знішчанай 11 верасня 1942 года. На граніцы гучалі вершы і проза. Пісьменнік, журналіст, галоўны рэдактар літаратурнага краязнаўчага альманаха Брэсцкага раёна «Астрамечаўскі рукапіс» Аляксандр Валковіч наведаў пагранзаставы «Знаменка» і «Дамачава». Ён расказаў аб сваёй вучобе, службе на турэцка-іранскай граніцы ў мястэчку Гюмры (Арменія, былы Ленінакан), стажыроўцы ў газеце «Красная Звезда», працы ў ваенных газетах, гісторыі стварэння сваіх твораў, лістах-трохкутніках, якія ляглі ў аснову яго кнігі «Пісьмы вайны».

Году гістарычнай памяці было адведзена галоўнае месца падчас выступленняў паэтэсы Таццяны Шульгі і яе мужа, старшыні Брэсцкай абласной арганізацыі «Честь и слава» Івана Шульгі. Госці наведалі пагранічныя заставы «Ліпінкі» і «Тамашоўка». На нядаўняй інфармацыйнай гадзіне пра падзеі на Брэстчыне ад старажытнасці да сучаснасці распавёў вайскоўцам аўтар прыгодніцкіх аповесцей Анатоль Брытун. Пінскія паэты Марыя Ляшук і Святлана Лёля наведалі пагранічную заставу «Дзівін». Падчас сустрэчы ішла размова аб важнасці захавання гістарычнай памяці. Пра беражлівыя адносіны да сваёй зямлі гаварыла Марыя Ляшук і ў аддзеле пагранічнай службы «Рэчыца» Столінскага раёна.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

Гучалі вершы...

Паэтычнае свята адбылося ў Мінску каля помніка класіку рускай і сусветнай літаратуры Аляксандру Пушкіну. Арганізавана яно было Мінскім гарадскім аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі, культурна-асветніцкай арганізацыяй «Наша Русь» і таварыствам дружбы «Беларусь — Расія».

Шматлікія прыхільнікі таленту вялікага рускага паэта, пісьменнікі і артысты ўсклалі кветкі да помніка. Вядучым свята выступіў старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт і перакладчык Міхась Пазнякоў. Перад прысутнымі выступілі таксама члены СПБ — паэты Вадзім Спрычан, Таццяна Жылінская, Валянціна Драбышэўская, Уладзімір Тулінаў, Генрых Тарасевіч. Празаік Дар'я Ніжнева прадставіла студэнтаў з Кітайскай Народнай Рэспублікі, якія прачыталі вершы Пушкіна на мове Паднябеснай.

Паэзія выдатнага паэта гучала таксама ў выкананні вучняў СШ № 218, студэнтаў Мінскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа, Мінскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага каледжа, навучэнцаў дзяржаўнай школы мастацтваў № 2 г. Мінска. Песні на яго вершы выканала артыстка Тэатра паэзіі МГА СПБ Наталля Хадкевіч. Напрыканцы свята прагучалі творы А. С. Пушкіна на беларускай мове ў перакладзе Міхася Пазнякова.

Міхаіл ПАЎЛАЎ

конкурсы

Паэтычны падарунак гораду

Народнае літаратурнае аб'яднанне «Наддзвінне» ініцыявала правядзенне адкрытага раённага літаратурнага конкурсу «Полацк любы…», прысвечанага Году гістарычнай памяці і 1160-годдзю заснавання Полацка, сярод школьнікаў і моладзі г. Наваполацка, г. Полацка і Полацкага раёна. Конкурс праводзіўся пры падтрымцы аддзела культуры Полацкага райвыканкама.

Арганізатарамі мерапрыемства, на якім былі прадстаўлены выключна паэтычныя творы, выступілі Полацкі раённы Цэнтр рамёстваў і нацыянальных культур і літаратурнае аб'яднанне «Наддзвінне».

Да ўдзелу ў конкурсе было пададзена 82 заяўкі, большасць з іх — на беларускай мове. Шчырыя пачуцці любові да нашага старажытнага і адначасова маладога горада, да сваіх знакамітых землякоў, пачуцці захаплення яго сучасным абліччам выказалі паэтычным радком юныя літаратары Полаччыны.

Духоўная тэма мела месца ў творах многіх канкурсантаў. І нядзіўна, бо Полацк жа — крыніца духоўнасці! У Год гістарычнай памяці многа ўвагі ўдзялілі канкурсанты гісторыі горада і яго героям.

Шмат вершаў на рускай і беларускай мове прыйшло ад новапалачан. Яны пішуць, што любяць і ганарацца і суседнім Полацкам, і родным Наваполацкам. Актыўнымі ўдзельнікамі былі школьнікі з СШ № 12 г. Наваполацка, у іх — чатыры дыпломы і тры фіналісты. З полацкіх школ самымі паспяховымі аказаліся вучні гімназіі № 2, на чыім рахунку тры дыпломы і чатыры фіналісты. З сельскіх школ вылучыліся юныя літаратары з ДУА «Гаранская дзіцячы сад — сярэдняя школа Полацкага раёна» і ДУА «Кушлікоўская дзіцячы сад — базавая школа Полацкага раёна».

Валянціна СОПІКАВА,
кіраўнік народнага літаратурнага аб'яднання «Наддзвінне»

на развітанне

На службе кнігі

13 чэрвеня, а другой гадзіне ночы, на 83-м годзе жыцця памёр беларускі бібліяфіл Алег Судлянкоў. У апошнія пятнаццаць-дваццаць гадоў ён часта выступаў у друку — у інтэрв'ю, з уласнымі артыкуламі. Часта можна было ўбачыць яго і ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Без Алега Аляксандравіча, яго дзейснага ўдзелу, здавалася, не абыходзілася ніводнае кнігазнаўчае мерапрыемства. Сціплы, інтэлігентны, ён не імкнуўся некага «забіваць», празмерна нагружаць сваімі ведамі.

Пачаўшы друкавацца болей як паўстагоддзя назад (першая заметка пра экслібрыс была змешчана ім ў шматтыражцы Беларускага політэхнічнага інстытута, які ён і закончыў), Алег Судлянкоў дзяліўся сваімі ведамі і ўражаннямі пра беларускі і сусветны экслібрыс. Бібліяфіл шмат ездзіў па рэспубліках Савецкага Саюза, удзельнічаў у форумах экслібрысістаў у краінах Еўропы. Пазнаёміўся з многімі дасведчанымі кніжнікамі свету. І пазнаёміў беларускіх мастакоў-графікаў з калекцыянерамі з іншых краін.

У пачатку 2022 года ў Выдавецкім доме «Звязда» выйшла кніга Алега Судлянкова «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў XVI—XX стст.». Гэтым выданнем была распачата нечаканая для беларускага кнігавыдання серыя — «Гісторыя кнігі». Яе заснавала выдавецтва ў супрацоўніцтве з міжнародным саветам серыі. Аб'ядналіся кандыдат мастацтвазнаўства, рэктар Беларускай акадэміі мастацтваў Міхаіл Баразна, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў Наталля Шаранговіч, кандыдат філалагічных навук Святлана Ананьева з Казахстана, кандыдат філалагічных навук Алег Ласунскі (Расія, Варонеж) і іншыя дасведчаныя асобы. Варта заўважыць, што мінулае выданне па гісторыі беларускага экслібрыса — «Беларускі кніжны знак» Віктара Шматава і Анатоля Тычыны — пабачыла свет у 1972 годзе. Паўвека маўчання!.. Паўвека маўчання пра такую выключна багатую ў мастацкім, гістарычным, культуралагічным плане з'яву, як беларускі экслібрыс, беларускі кніжны знак!..

Несумненна, кнігу ўбачылі. Пра яе даведаліся ў іншых краінах, якія так ці іначай у сваёй мастацкай гісторыі і сучаснасці перасякаюцца з Беларуссю. Алег Судлянкоў, маючы і мноства іншых планаў, паспеў падсумаваць пражытае, зробленае, адкрытае… Шчаслівы лёс калекцыянера!.. Часцей здараецца іначай: калекцыі губляюцца, пра іх не паспяваюць распавесці, захаваць дакументальныя сведчанні…

Светлая памяць Алегу Аляксандравічу Судлянкову! Шчырае захапленне яго збіральніцкім, кніжным талентам!..

Раман СЭРВАЧ

«ЛіМ»-люстэрка

Міжнародны фестываль тэатраў лялек «Скрыжаванне», які другі раз прайшоў у Новасібірску, прынёс беларускаму тэатру «Лялька» з Віцебска прыз за найлепшую акцёрскую работу Вольгі Лазебнай. На фестывалі віцебскія лялечнікі адзіныя прадстаўлялі Беларусь і прэзентавалі спектакль «Жыўбыў Заяц». Вольга Лазебная ў ролі Мусі пакарыла прафесійнае журы і сібірскага гледача. Спектакль, які ў рэпертуары тэатра ўжо больш за 12 гадоў, «Лялька» паказвалася традыцыйна на беларускай мове, але гэта зусім не перашкаджала рускамоўным дзецям, і яны жыва ўключаліся ў інтэрактыўныя элементы паказу. Таксама твор быў адзначаны за пазітыў дыпломам удзельніка. Акрамя ўзнагарод, віцебскія артысты атрымалі прафесійны разбор ад членаў журы, змаглі пабываць на спектаклях многіх калег і ўбачыць, як развіваюцца лялечныя тэатры Расіі і Таджыкістана, што былі прадстаўлены на фестывалі.

Фестываль народнай творчасці «Вянок дружбы» пройдзе ў Бабруйску 23—27 чэрвеня, перадае БелТА. «Міжнародны фестываль уключаны ў План мерапрыемстваў СНД на 2022 год, — цытуе агенцтва словы начальніка аддзела культуры Бабруйскага гарвыканкама Вадзіма Шчэрбіча. — «Вянок дружбы» адбудзецца на бабруйскай зямлі ўжо 16-ы раз. Месца яго правядзення выбрана невыпадкова: горад на Бярэзіне славіцца сваёй шматвяковай гісторыяй, багатымі міжэтнічнымі і нацыянальна-культурнымі традыцыямі. Сёлета Бабруйск адзначае сваё 635-годдзе». Выступленні на фестывалі не маюць конкурснага характару і праходзяць пад дэвізам роўнай значнасці і мастацкай каштоўнасці яго ўдзельнікаў, нацыянальных культур і традыцый. Канцэрты і творчыя сустрэчы пройдуць як у Бабруйску, так і ў іншых рэгіёнах Магілёўскай вобласці.

Выстаўку «Памяць пакаленняў» прадставяць на X Беларуска-расійскім маладзёжным форуме, які пройдзе 20—22 чэрвеня ў Брэсце. Пра гэта паведамілі на прэс-канферэнцыі «Роля маладзёжных грамадскіх аб'яднанняў у патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення» ў прэс-цэнтры Дома прэсы. Экспазіцыя, прысвечаная памяці аб падзеях Першай і Другой сусветных войнаў, сабрала вынікі работы пошукавых клубаў, у прыватнасці рознага кшталту артэфакты: узнагароды, зброю, фатаграфіі. Выстаўка «Памяць пакаленняў» — адзін з яркіх праектаў маладзёжнага грамадскага аб'яднання «Прасоўванне моладзі». Зусім нядаўна экспазіцыя праходзіла ў Студэнцкай вёсцы, зараз чакаецца ў Брэсце на X Беларуска-расійскім маладзёжным форуме, перадае БелТА.

Дзесяць аўтараў сталі фіналістамі літаратурнай прэміі «Большая книга». Як інфармуе РІА «Новости», у шорт-ліст увайшлі Павел Басінскі («Сапраўдная гісторыя Ганны Карэнінай»), Сяргей Белякоў («Парыжскія хлопчыкі ў сталінскай Маскве»), Аляксей Варламаў («Імя Розанава»), Дзмітрый Данілаў («Саша, прывітанне!»), Алег Ермакоў («Крыніца Олафа»), Руслан Казлоў («Stabat Mater»), Афанасій Мамедаў («Параход Бабелон»), Ганна Мацвеева («Кожныя сто гадоў. Раман з дзённікам»), Сафія Сініцкая («Хроніка Гарбатага») і Гузель Яхіна («Эшалон на Самарканд»). Зараз работу пачне журы, у якое ўваходзяць члены Літаратурнай акадэміі, — гэта больш за сто прафесійных літаратараў, дзеячаў культуры, навуковых работнікаў, грамадскіх і дзяржаўных дзеячаў, журналістаў, прадпрымальнікаў. З чэрвеня на кніжным сэрвісе *LiveLib* на працягу некалькіх месяцаў кожны ахвотны зможа прагаласаваць за твор, які спадабаўся. Прачытаць і паслухаць кнігі можна на сайце і ў дадатках сэрвісу «ЛитРес».

Помнік савецкаму і расійскаму акцёру тэатра і кіно Васілю Ланавому адкрылі ў Керчы. Бюст заслужанага артыста Расіі знаходзіцца каля тэатра імя А. С. Пушкіна. Васілю Ланавому ў 2019 годзе рашэннем Керчанскага гарсавета было прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада-героя Керчы» за асабісты ўклад у развіццё рускай культуры і мастацтва, патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. Бронзавы бюст вялікага артыста створаны скульптарам Салаватам Шчарбаковым у рэалістычнай манеры і перадае характар і вонкавыя рысы акцёра, паведамляе карэспандэнт РІА «Новости».

Рыхтуецца прэм'ера лялечнага мультфільма «Пінокіа Гільерма дэль Тора». Лаўрэат «Оскара» выступіў рэжысёрам, сцэнарыстам і прадзюсарам новай экранізацыі. Дзеянне «Пінокіа» будзе адбывацца ў 1930-х гадах у фашысцкай Італіі. З Пінокіа захочуць зрабіць ідэальнага салдата, бо ён зроблены з дрэва, а значыць, бессмяротны. Ролі ў новай версіі агучвалі Кейт Бланшэт, Юэн МакГрэгар, Тыльда Суінтан, Крыстаф Вальц, Фін Вулфхард, Дэвід Брэдлі і Джон Туртура. Дакладная дата рэлізу не ўдакладняецца. Гэта другая за год экранізацыя казкі Карла Калодзі. У верасні *Disney+* выпусціць чарговага «Пінокіа» ад рэжысёра Роберта Зэмекіса з Томам Хэнксам у ролі Джэпета, гаворыцца на сайце «film.ru».

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Пётр ПАДГУРСКІ:

«Не пакінем таго, чаму навучыліся за гэты час»

Як захоўваюць гісторыка-культурную спадчыну ў Віцебскай вобласці? Як адзначаюць Год гістарычнай памяці ў рэгіёне? Што назіраецца апошнім часам у бібліятэчнай сферы? І куды варта завітаць тым, хто жадае даведацца як мага больш пра Віцебшчыну? Пра гэта чытачам «ЛіМа» расказвае начальнік упраўлення культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта Пётр Падгурскі.

— У спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей уваходзіць шмат аб'ектаў Віцебскай вобласці. Якія з іх у гэтым пераліку значацца нядаўна? Магчыма, штосьці плануюць уключыць у бліжэйшы час?

— У 2021 годзе ў Дзяржаўны спіс уключаны дзве нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці — «Беларускае мастацтва выцінанкі» (у цэлым па краіне) і «Ткацтва посцілак у тэхніцы аднабаковага перабору» ў Лепельскім раёне, а таксама два матэрыяльныя аб'екты. Гэта комплекс былой сядзібы Цюндзявіцкіх у Галошаве Талачынскага раёна і помнік на месцы гібелі генерала Якава Кульнёва ў Полацкім раёне. Сёлета ўжо надалі статус нематэрыяльных каштоўнасцей стравам з бульбы Віцебскай вобласці. Плануецца дадаць туды і традыцыйнае інструментальнае выкананне на дыятанічных цымбалах (гэта Пастаўскі раён) і традыцыйны народны лялечны тэатр «Віцебскі жлоб».

У Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі ўключана 966 аб'ектаў, размешчаных на тэрыторыі Віцебскай вобласці, у тым ліку помнікі горадабудаўніцтва (2), помнікі архітэктуры (299); помнікі археалогіі (370); помнікі гісторыі (264, абсалютная большасць з якіх — воінскія пахаванні); помнікі мастацтва (4); запаведныя месцы (2); рухомыя матэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці (6); нематэрыяльныя гісторыка-культурныя каштоўнасці (19).

— Раскажыце, калі ласка, пра планы па захаванні гісторыка-культурнай спадчыны на 2022 год.

— Знакавы аб'ект у гэтым плане — Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку, дзе працягваюцца маштабныя работы па аднаўленні фрэсак XII стагоддзя і рэканструкцыі самога храма. Акрамя гэтага, вядуцца работы на тэрыторыі Верхняга замка ў Полацку, уключаючы маштабныя археалагічныя даследаванні, якія не маюць аналагаў у краіне ў апошнія гады. Арганізавана праца і на будынку былога вінаачышчальнага склада ў Лепелі, які будзе прыстасаваны пад музей. Дарэчы, маюцца прыклады актывізацыі дзейнасці па рэстаўрацыі з боку прыватнага бізнесу. У першую чаргу гэта тычыцца будынкаў у буйных гарадах, хаця ёсць цікавасць і да былых сядзіб. Апошняй катэгорыі, у першую чаргу тым аб'ектам, якія на дадзены момант не выкарыстоўваюцца, надаецца асаблівая ўвага з боку урада, Міністэрства культуры і мясцовых улад. У прыватнасці, усе яны могуць быць рэалізаваны на льготных умовах ці выкарыстаны для рэалізацыі інвестыцыйных праектаў. Спіс падобных месцаў і невялікі відэаролік пра іх можна паглядзець на сайце Віцебскага аблвыканкама.

— Пералічыце асноўныя конкурсы, акрамя, зразумела, тых, што адбываюцца ў рамках Славянскага базару, якія праходзяць у рэгіёне. Якія з іх, на вашу думку, заслугоўваюць асаблівай увагі?

— Віцебшчына, сапраўды, — не толькі Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар». У нас маецца 12 міжнародных і 4 рэспубліканскія фестывалі і святы, якія фінансуюцца з удзелам рэспубліканскіх і абласных сродкаў. А яшчэ шмат разнастайных рэгіянальных мерапрыемстваў. Напрыклад, у Сафійскім саборы ў Полацку штогод праходзяць Міжнародны фестываль старажытнай і сучаснай камернай музыкі і Міжнародны фестываль арганнай музыкі «Званы Сафіі». У тым жа Полацку вялікі поспех сярод блогераў і аматараў кіно мае рэспубліканскі адкрыты конкурс аматарскіх фільмаў імя Юрыя Тарыча «Я здымаю кіно». Заўсёды з размахам праходзяць Міжнароднае свята традыцыйнай культуры «Браслаўскія зарніцы», Міжнародны фестываль песні і музыкі «Дняпроўскія галасы ў Дуброўне», Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік», Міжнароднае свята «Вішнёвы фестываль», Міжнародны конкурс юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-Хало» і іншыя знакавыя культурныя падзеі. Па сутнасці, кожны раён і горад вобласці мае што паказаць і куды запрасіць гасцей і ўдзельнікаў.

Фота БелТА.

— А куды будуць запрашаць падчас правядзення мерапрыемстваў Года гістарычнай памяці?

— Гэтая тэма будзе ісці своеасаблівым рэфрэнам ва ўсіх установах культуры. Але ёсць асобныя мерапрыемствы, на якія трэба звярнуць увагу. Напрыклад, круглы стол «Праблемы вывучэння гісторыі партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны на сучасным этапе», віртуальны праект «Кніга «Памяць». Віцебская вобласць». Гаворка вядзецца пра прэзентацыю віртуальнай базы даных загінуўшых ураджэнцаў рэспублік СССР на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў гады Вялікай Айчыннай вайны, распрацаванай Віцебскім абласным музеем імя Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова. Запланаваны імпрэзы, прысвечаныя больш далёкім стагоддзям. Напрыклад, выстаўка «Полацк Ганзейскі», дзе будуць прадстаўлены свінцовыя пломбы і пячаткі з калекцыі археалогіі музейнага збору Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

— Што апошнім часам адбываецца ў бібліятэчнай сферы? Чым спрабуюць зацікавіць сталых і юных чытачоў?

— Тут назіраюцца лагічныя вынікі інфарматызацыі. Новыя ўмовы, распаўсюджанне гаджэтаў і дамінаванне інтэрнэту прыводзіць да скарачэння колькасці чытачоў. Пры гэтым бібліятэчныя супрацоўнікі не сядзяць на месцы, а ідуць у нагу з часам. Яскравы прыклад — Віцебская абласная бібліятэка імя Леніна, якая здолела заняць сваю нішу ў інтэрнэт-прасторы за кошт размяшчэння электроннага каталога, алічбаваных дакументаў, сур'ёзных тэматычных баз даных і іншага цікавага і запатрабаванага кантэнту. У выніку толькі за 2021 год сайт бібліятэкі наведала звыш 1,8 мільёна чалавек. Гэта велізарныя лічбы для ўстаноў культуры. Але ж і саму абласную бібліятэку прыемна наведваць. Пры магчымасці рэкамендуем усім гэта зрабіць. Таму што цяпер там не проста чытальныя залы, але і ўтульны і крэатыўны інтэр'ер, які стварае сапраўдную творчую атмасферу і дае магчымасць атрымаць асалоду ад чытання. Тое ж самае можна сказаць пра дзіцячы аддзел, які больш нагадвае яркую гульнявую пляцоўку, ад якой дзяцей не адцягнуць. Яны самі могуць хадзіць сярод паліц і выбіраць цікавыя кніжкі. Усё гэта рэальна працуе.

У вобласці ў кожным раёне ёсць уласны музей. Агульная колькасць дзяржаўных музеяў сферы культуры складае 28. Сярод найбольш запатрабаваных — Віцебскі абласны краязнаўчы музей і Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, якія маюць шмат філіялаў. У Год гістарычнай памяці вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў і школьнікаў карыстаецца Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза Міная Піліпавіча Шмырова. Турысты часцей за ўсё наведваюць Музей Марка Шагала ў Віцебску, Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча, якія звязаны з імёнамі сусветна вядомых мастакоў.

— Як справы ў іншых кніжніцах?

— Зразумела, што звычайныя, тым больш рэгіянальныя бібліятэкі не могуць па гэтых паказчыках дасягнуць узроўню абласной, але і там ёсць чым ганарыцца. У паўночным рэгіёне Беларусі інфармацыйнае абслугоўванне ў сельскай мясцовасці ажыццяўляюць 318 бібліятэк. Для жыхароў населеных пунктаў, дзе адсутнічаюць стацыянарныя ўстановы культуры, даступнасць паслуг забяспечваецца мабільнымі бібліятэкамі, якія выязджаюць па графіках зацверджаных маршрутаў і наведваюць карыстальнікаў з 690 аддаленых і маланаселеных вёсак. На выклікі часу бібліятэкі адказваюць усё часцей праектнай дзейнасцю. Паспяхова рэалізоўваюцца праекты, скіраваныя на сацыяльную адаптацыю пажылых людзей, людзей з абмежаванымі магчымасцямі і выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу: «Мы — разам» Вусценскай сельскай бібліятэкі (Аршанскі раён), «Шлях да кнігі» Відзаўскай гарпасялковай бібліятэкі (Браслаўскі раён). Этнаграфічны праект Руднянскай бібліятэкі-філіяла № 43 па стварэнні пакоя-музея «Вачыма продкаў» з прадметамі побыту канца XIX — пачатку XX стагоддзяў стаў настолькі папулярным сярод жыхароў вёскі, што пераўтварыўся ў мабільны і экспанаваўся ў 6 філіялах Полацкай бібліятэчнай сістэмы. Жыхары горада не толькі ацанілі цікавую экскурсійную праграму, але і прымалі актыўны ўдзел у арганізаваных фальклорных святах. Плённа працуюць бібліятэкі Лёзненскага раёна. Так, Кавалёўская сельская бібліятэка ажыццяўляе пошукавую работу па гісторыі народных гульняў, звычаяў, традыцый і самабытнай культуры. Запісаны і абагулены матэрыялы носьбітаў вуснай народнай творчасці, бытавых танцаў, у тым ліку аўтэнтычнай Лёзненскай кадрылі, характэрнай для канкрэтнай мясцовасці.

Сёння раёны маюць свае адметныя культурныя праекты, якія адлюстроўваюць мясцовыя асаблівасці. Набіраюць папулярнасць свята аматарскіх аб'яднанняў «Яблычны фэст», якое праводзіцца на радзіме селекцыянера Івана Сікоры ў вёсцы Алашкі Шаркаўшчынскага раёна, рэгіянальнае свята «Гарадоцкі Парнас» у гонар аўтара паэмы «Тарас на Парнасе» Канстанціна Вераніцына, фестываль вулічнага мастацтва «Волаты Прыдзвіння» ў Віцебскім раёне, экалагічнае свята «Жураўлі і журавіны Мёрскага краю» і шэраг іншых.

— Калі поспехі ў гэтым кірунку ў бібліятэк, што ўжо казаць пра музеі… На якія з іх варта звярнуць увагу аматарам гісторыі і мастацтва? Куды параіце чытачам завітаць?

— У ліку найбольш папулярных — Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Музей Марка Шагала ў Віцебску, Музей гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча. Таксама цікавасць для турыстаў павінны ўяўляць Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку, Музей-сядзіба Ільі Рэпіна «Здраўнёва», Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў, Глыбоцкі гісторыка-этнаграфічны музей і яго філіял у Мосары, Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны…

— Што новага ў гэтай сферы?

— У вобласці актыўна вядзецца работа па стварэнні новых экспазіцый музеяў. Так, у пачатку мая была адкрыта абноўленая экспазіцыя ва Ушацкім музеі народнай славы імя Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Лабанка. Арганізоўваюцца новыя экспазіцыі ў Шумілінскім гісторыка-краязнаўчым музеі, а таксама ў новым будынку Музея Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава. Важнай задачай для музеяў з'яўляецца правядзенне на высокім узроўні юбілейнага 5-га нацыянальнага форуму «Музеі Беларусі», які пройдзе гэтай восенню ў Віцебску і ў якім павінны прыняць удзел усе музеі Віцебскай вобласці. Гэтае мерапрыемства змогуць наведаць усе ахвотныя.

— З якімі цяжкасцямі сутыкнулася ўпраўленне культуры апошнім часам? Як спрабуеце іх вырашыць?

— Доўгі час усе ўстановы культуры вобласці вымушаны былі працаваць ва ўмовах эпідэміялагічных абмежаванняў. Гэта адмоўна ўплывала на наведванне і колькасць мерапрыемстваў. У гэтым плане асабліва складаная сітуацыя была ў музеях. Напрыклад, 70 % ўсіх наведвальнікаў Музея Марка Шагала ў Віцебску ў перыяд да пандэміі складалі замежныя турысты. Увядзенне абмежаванняў на межах РФ і іншых краін вельмі балюча ўдарыла па гэтай і іншых установах культуры. Для вырашэння праблемы і прыцягнення наведвальнікаў музеі пайшлі ў інтэрнэт. У выніку, напрыклад, ролікі супрацоўніцы Віцебскага мастацкага музея Анастасіі Папроцкай пра асобныя знакавыя творы з фондаў установы за кароткі час набралі тысячы праглядаў у *YouTube*. На шчасце, сітуацыя змянілася ў станоўчы бок. Таму будзем спадзявацца, што многія нашы праблемы застануцца ў мінулым, але мы не пакінем таго, чаму навучыліся за гэты час.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Заўтра пачалася вайна

22 чэрвеня — Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. 81 год назад фашысцкая Германія вераломна напала на Савецкі Саюз. Дата, як быццам, «не круглая». Ды яна такая, пра якую трэба памятаць заўсёды. Асабліва пры набліжэнні чарговай гадзіны «радости со слезами на глазах». У сучасных умовах — тым больш. Як ніколі дагэтуль настырна дзейнічаюць ахвотныя перакроіць карту свету. Свайго жадання не хаваюць нават у краінах, якія некалі ўваходзілі ў антыгітлераўскую кааліцыю. Уласны парадак збіраюцца ўсталёўваць і родзічы фашысцкіх недабіткаў, што цяпер пры ўладзе ў некаторых краінах Еўропы.

Напамін Юліуса Фучыка, як ніколі, актуальны: «Людзі, будзьце пільнымі!» Пастаянна павінны памятаць пра гэты і мы, беларусы, якія першымі пачалі адлік тым гераічным і страшным 1418 дням і начам, што забралі з сабой кожнага трэцяга нашага суайчынніка. Аднак менавіта Беларусь першай і засведчыла, што з навядзеннем «новага парадку» на нашай зямлі нічога не атрымаецца. Ужо 22 чэрвеня 1941 года на базе Заходняй асобай ваеннай акругі быў створаны Заходні фронт. У яго склад увайшлі 3, 4, 10, 13 арміі. З першых дзён войскі прынялі на сябе ўдар пераўзыходзячых сіл ворага. Яркай старонкай у гэтую ўсенародную барацьбу ўпісалася гераічная абарона Брэсцкай крэпасці. Сярод тых, хто першым уступіў у бой з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, быў і беларускі пісьменнік, а тады лейтэнант Алесь Махнач.

Родам з Уздзеншчыны

Малая радзіма Алеся Іванавіча — Уздзеншчына. Край салаўіны, песенны. Столькі талентаў тут нарадзілася, што ён нават можа паспаборнічаць са Случчынай. А вёска Нізок — цэлае сузор'е: народны пісьменнік Беларусі Кандрат Крапіва, Паўлюк Трус, Лідзія Арабей. Ды і народны артыст Беларусі Анатоль Трус — таксама тамашні. У Нізку нарадзіўся і Іван Махнач, але перабраўся ў суседняе Забалацце, дзе ў маладой сям'і і з'явіўся на свет сын, названы Алесем.

Закончыўшы мясцовую пачатковую школу, два гады пасвіў калгасную жывёлу. Потым вучыўся ва Уздзенскай сярэдняй школе. Пасля васьмі класаў паступіў у ваеннае вучылішча. 18 чэрвеня 1941 года, ён, малодшы лейтэнант, разам з іншымі курсантамі-выпускнікамі прыбыў для праходжання службы ў Брэсцкую крэпасць. На жаль, ваяваў нядоўга.

Пра гэта апавядаў неахвотна. Больш расказваў пра тых, з кім звёў баявы лёс. Пра іх пісаў і ў сваіх творах. Прычына зразумелая: давялося трапіць у палон. А да ваеннапалонных, асабліва ў першыя пасляваенныя гады, стаўленне было, мякка кажучы, неадназначнае. Як і да тых, хто зведаў жахі канцлагераў. Толькі на схіле жыцця разгаварыў Алеся Іванавіча сын, пісьменнік Максім Клімковіч. Рэжысёр Валерый Жыгалка па яго сцэнарыі, напісаным сумесна з Уладзімірам Сцяпанам, паставіў дакументальны фільм «Я, лейтэнант Махнач» (у цітрах Уладзімір Сцяпан называецца пад сваім сапраўдным прозвішчам Сцепаненка). Тады і паўстала тая праўда, пра якую многія не ведалі. А яна такая…

Узвод! У ружжо!

Маладых камандзіраў, калі яны падышлі да Мухаўца, уразіла адсутнасць на супрацьлеглым баку ракі нямецкіх пагранічнікаў. Замест іх там ужо знаходзіліся палявыя часці. І паводзілі сябе гітлераўцы дзіўна. Махалі рукамі, весела крычалі: «Сталін — Гітлер — гут-гут!». Канешне ж, ведалі тое, чаго савецкім пагранічнікам было невядома. Толькі да вышэйшага камандавання даходзілі чуткі аб магчымым нападзе Германіі. Ды іх успрымалі звычайнай правакацыяй. Але нядаўняя выпускнікі спадзяваліся, што ў іх служба складзецца мірна.

Добра пачыналася яна і ў лейтэнанта Махнача. Следам за першым афіцэрскім званнем прысвоілі наступнае. Ён, ужо лейтэнант, прыняў у малодшага лейтэнанта Смагіна ўзвод. Пасля заканчэння палявых заняткаў Смагін прапанаваў гэта адзначыць. Як не згадзіцца, калі заўтра выхадны, нядзеля.

Вечарам 21 чэрвеня накіраваліся ў гарадскі парк. Зайшлі ў кафэ, заказалі бутэльку белага грузінскага віна, цукерак. Хутка да іх падышла дзяўчына Смагіна. Каб не перашкаджаць, Алесь пакінуў іх і пайшоў прагуляцца па горадзе. У казарму вярнуўся позна ноччу. Папрасіў дняльнага разбудзіць у сем гадзін раніцы. Ботаў не здымаў. Расшпіліў каўнер, расслабіў партупею і імгненна заснуў.

Праспаў толькі нейкую гадзіну-другую і… апынуўся на падлозе. Гэта ўдарная хваля выбіла ў казарме дзверы. У паўзмроку мітусіліся нейкія цені. Зразумеў, што пагранічнікі не паспелі апрануцца. Закрычаў: «Я — лейтэнант Махнач! Слухай маю каманду! У ружжо!»

Вінтоўка ж пры кожным была, а дзе захоўваюцца скрыні з патронамі, за некалькі дзён службы даведацца не паспеў. Разлічваць на чыю-небудзь дапамогу не выпадала. Большасць камандзіраў пражывалі ў горадзе. Але нарэшце адшукалі не толькі патроны, але і гранаты, кулямёты. І нават новенькія аўтаматы ППШ з дыскавымі магазінамі.

Улажыў… чырвонаармейца

На той час яны лічыліся сакрэтнай зброяй. У вучылішчы курсанты падпіску давалі аб невыдаванні тайны. Цяпер жа асвойваў іх, як кажуць, на ляту. І іншым падказваў, як трэба карыстацца. Усё гэта рабілася пад суцэльным агнём праціўніка. З'явіліся і праблемы з ежай. Харчовыя склады былі разбомблены. Пашанцавала, што знайшлі тазік масла, сухары. З вадой таксама была нявыкрутка. Мухавец, праўда, поруч, аднак да яго не прабіцца. Нямецкія снайперы пастрэльвалі бераг безупынку. Адзінае выйсце — у цемры дабрацца да ракі паміж запускамі сігнальных ракет. Але не ўсім шанцавала застацца ў жывых. Ды і то спачатку ваду залівалі ў кулямётныя кажухі, каб астудзіць іх. Пасля давалі раненым.

А варожае кальцо ўсё сціскалася і сціскалася. Ужо і казарму, што знаходзілася побач, гітлераўцы захапілі. Гаспадарамі сябе адчуваюць. Нікога не баяцца. Ноччу размясціліся на другім паверсе і кураць. Злосць узяла лейтэнанта Махнача. Звязаў некалькі гранат і з двума чырвонаармейцамі праз падвал прабраўся ў тую казарму. Удар быў такі моцны, што цагляныя сцены не вытрымалі і пахавалі пад сабой фашыстаў. Даставалася, аднак, і Алесю Іванавічу. Прыйшоў у сябе толькі пасля таго, як байцы пачалі яго трэсці. Нешта крычаць, а ён не чуе, з вушэй кроў цячэ.

Зусім не па сабе стала, калі аднойчы сутыкнуўся з чырвонаармейцам, які наставіў на яго пісталет. Адбылося гэта перад чарговай варожай атакай. Залёг за кулямётам, прымасціўся так, каб як мага больш палажыць немцаў. І раптам адчуў, што быццам токам у нагу ўдарыла. Абярнуўся — і стала не па сабе. Гэта ў яго выстраліў чырвонаармеец і другі раз цэліўся. Абодва стрэлілі адначасова. Выстрал Алеся Іванавіча аказаўся смяротным. Усё стала зразумелым, калі агледзеў забітага. У яго пад гімнасцёркай быў нямецкі унтэр-афіцэрскі кіцель. Як высветлілася, гітлераўцы закінулі ў крэпасць дэсант, апрануты ў чырвонаармейскую форму.

Мёртвыя ратавалі жывых

Абаронцы працягвалі трымацца мужна, але сілы былі няроўныя. Усё больш станавілася забітых, шмат раненых. Для іх месца ў падвале не ставала. Таму некаторых перанеслі ў суседні будынак, дзе дагэтуль знаходзіўся батальён сувязі. Хутка трапіў туды і Махнач. Каб немцы ведалі, што тут знаходзяцца нямоглыя, на варотах намалявалі чырвоны крыж. Толькі да раненых? Разумелі, што, калі выжывуць, адпомсцяць і за іх. Але група чалавек з сарака з лейтэнантам Вінаградавым пры пераправе ноччу праз Мухавец загінула.

Аднак і раненыя без бою здавацца не збіраліся. Пры атацы гітлераўцаў Махнач залёг за кулямёт. Як успамінаў, варожыя «кулі барабанілі па шчытку, па камянях, асколкі секлі твар, рукі». Прыйшоў у сябе на пантоне. Спачатку немцы адносіліся больш-менш спагадліва. Нават дазволілі медыкам, якія таксама трапілі ў палон, рабіць нескладаныя аперацыі.

Затое лагер ваеннапалонных пад Брэстам стаў сапраўдным пеклам. З 12 тысяч чалавек выжыла каля 300. Амаль не кармілі. Толькі давалі крыху хлеба і вады. Пачаўся тыф. Гэта ў нейкай ступені ратавала жывых. Раней памерлых выносілі за межы лагера, цяпер яны заставаліся на яго тэрыторыі. Хлеб жа кідалі ў разліку на колькасць чалавек, якая была дагэтуль.

Выстаяў

На валасок ад смерці быў і тады, калі перавозілі ў Чанстахова, дзе знаходзіўся філіял Майданека. У падлозе таварняка, у якім іх везлі, зняволеныя зрабілі дзірку, і некаторыя выскаквалі на хаду. Даведаўшыся пра гэта, немцы спынілі цягнік. Вывелі ўсіх і загадалі легчы тварам на зямлю. Адзін з афіцэраў, трымаючы ў руцэ пісталет, праходзіў міма іх прамаўляючы: «Айн, цвай, драй…» і страляў у патыліцу чарговай ахвяры. З болем прыгадваў у фільме: «Тройчы даводзілася так класціся. Я ляжаў і думаў: хай бы ўжо адлік на мне закончыўся, скончыліся б і пакуты. Пасля вайны я не тое што гаварыць па-нямецку не мог — я чуць гэтую мову не мог! Потым, калі ў Літаратурным інстытуце ў Маскве вучыўся, мне як беларусу дазволілі замест нямецкай мовы рускую здаваць. Так у маім дыпломе і запісана: «замежная мова — руская».

Але да гэтага моманту трэба было дажыць. 1 снежня 1944 года каля пяцісот палонных савецкіх афіцэраў даставілі ў канцлагер «Везуве» на мяжы з Галандыяй. Былі вызвалены 5 красавіка 1945 года канадцамі. Дэмабілізаваўся ў 1947 годзе.

Загадваў Прысынкаўскай сельскай бібліятэкай на Уздзеншчыне. З 1953 года быў бібліятэкарам газеты «Літаратура і мастацтва», адначасова вучыўся на завочным аддзяленні Мінскага бібліятэчнага тэхнікума. Літаратурны інстытут закончыў таксама завочна. У 1956—1968 гадах зноў працаваў у «ЛіМе», ужо літсупрацоўнікам. Сваё творчае прызванне знайшоў у драматургіі. У асноўным пісаў аднаактоўкі, адрасаваныя ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці. Поспех мелі і шматактовыя творы «Шпачок» і «Гаўрошы Брэскай крэпасці», якія ставіліся не толькі ў тэатрах Беларусі.

Заступнік подзвігу

Жыў Алесь Іванавіч сціпла. Прымаючы пад увагу яго гераічна-пакутную біяграфію, нават залішне. А ён жа, па дакладным вызначэнні народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна, быў «заступнікам подзвігу». Менавіта так — «Заступнік подзвігу» — назваў Рыгор Іванавіч свой верш, прысвечаны гэтаму цудоўнаму чалавеку і пісьменніку:

Алесь Махнач.

Граніт вуглее ў мураве,
А мужная легенда крэпасці
У ім адным
Ва ўсёй канкрэтнасці
Працягваецца і жыве.

Яго баі не адгулі.
Гады ідуць,
А ён накульгвае,
Праслухоўваючы чуйнай кульбачкай
Дол, як мінёр, —
Баліць зямлі.

Ніяк не пасвятлее Буг,
І міна памяці
Зацятая.
Яго спакой
Дагэтуль катуе,
Што разам з выбухам
Аглух.

Усіх жывых
Клапоціць рух,
Хто цісне нацянкі,
Хто подбегам.
Спаважна
Ён ступае з подзвігам,
І вечнасць іх чакае —
Двух!

Пайшоў Алесь Махнач у вечнасць 8 жніўня 2001 года. Сёлета 27 жніўня спаўняецца 100 гадоў, як з'явіўся на свет. Аднак, без перабольшання, яго дзень нараджэння і ў чэрвені 1941-га. Нягледзячы на нечалавечыя выпрабаванні, выжыў, то як ні ўспомніць яго ў гэтыя дні нашай усенароднай памяці. Я ж заўсёды прыгадваю Алеся Іванавіча, калі бяру ў рукі яго кнігу «Камандзір Усходняга фронту». Гэта дакументальная аповесць пра Героя Савецкага Саюза Пятра Гаўрылава, легендарнага абаронцу Брэсцкай крэпасці, адрасаваная школьнікам. Для іх напісаў і дакументальную аповесць «Дзеці крэпасці».

Алесь Махнач — таксама герой. Беларусі, Брэста. Справа не ў афіцыйным прызнанні, а ў тым, што на яго прыкладзе трэба вучыць сённяшніх школьнікаў любіць Радзіму. Для гэтага нябыла перавыдаць і асобныя яго творы. У тым ліку і «Камандзіра Усходняга форта», на якой Алесь Іванавіч пакінуў мне такі кранальны надпіс: «Дарагому сябру Алесю Марціновічу, цудоўнаму літаратуразнаўцу, пісьменніку, шчыраму чалавеку — з найлепшымі пажаданнямі.

Подпіс.
7.2.94 г.
г. Мінск».

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Вандроўка ў сябе

Экзістэнцыя ў планах не толькі «я — у гэтым жыцці», «я — у творчасці», але і «я — частка гэтай зямлі», ментальная і падсвядомая повязь з яе знакавымі асобамі, адметная, яркая, а дзе-нідзе і побытавая вобразнасць у замалёўках-вершах, ланцужковыя асацыяцыі — вось чым вызначаецца зборнік паэзіі Віктара Шніпа «Васільковы мёд», што нядаўна пабачыў свет у Выдавецкім доме «Звязда».

Серыя, у якой выйшла кніга, хоць і не пазначана асобнай назвай, але паспела ўжо звярнуць на сябе ўвагу чытача: невялікага аб'ёму зборнікі паэзіі пад мяккай, але не маркай вокладкай, дзе творы прадстаўлены храналагічна больш-менш раўнамерна, пачынаючы ад першых публікацый, прыемна разгарнуць, пачытаць хаця б наўздагад — і займееш уяўленне пра пісьменніцкую манеру таго ці іншага літаратара. Так, ужо маем выданні Анатоля Сыса «Званы», Леаніда Дранько-Майсюка «Скарб», Генадзя Бураўкіна «Мой боль і запавет», Алеся Бадака «Уладар ветру», Рыгора Барадуліна «Ніткі бліскавіц», зборнік паэзіі Гарадзеншчыны «Спрадвечны бераг».

Вабная назва «Васільковы мёд» адсылае да знакамітай песні-балады «Верасовы мёд» Роберта Льюіса Стывенсана. Ці выпадкова?.. Пагатоў, аўтар «Васільковага…» — знаны апошнія дзесяцігоддзі аматар баладнага жанру.

У зборнік трапілі вершы, пачынаючы з 1977 года (аўтару на той момант — сямнаццаць!) да 2018, раздзеленыя на пэўныя перыяды. Уражвае, што больш яскравая вобразнасць характэрна менавіта для маладой паэзіі В. Шніпа, да 1991 года. І тут міжволі згадваюцца разважанні аб тым, што з узростам, калі слабее эмацыянальны запал, большасць пісьменнікаў, якія ў маладосці пісалі вершы, пераходзяць на прозу. Але вернемся да «Васільковага мёду» і паспрабуем яго на смак:

У сэрцы ёсць таксама вёска Пугачы,
Таму сцяжыны не губляюцца ў лугах,
У агародчыках красуюць касачы,
Буслы
на захад
сонца коцяць па дубах.
(1980)

Вобразнасць настолькі сакавітая, што нават пры адсутнасці азначэнняў фарбаў і адценняў, пры мінімуме скарыстаных сродкаў карцінку адразу бачыш перад вачыма ва ўсёй яе шматколернасці і паўнаце. Тое ж характэрна і для наступных прыкладаў:

* * *
Першага снегу святло,
Ты для мяне як свята.
Сонца памалу ўзышло
З коміна крайняй хаты.

…Ціха на ганку стаю,
Снег патушыць баюся.
(1982)

* * *
Холад ля хаты пасе снегіроў.
Сонца замецена снегам у полі.
Бацька дадому сцяжыну прывёў,
Следу не бачна ва ўсім навакольлі.
(1982)

Увогуле, аўтар абыходзіцца мінімальнымі сродкамі, але сэнс і яснасць праз гэта не збядняюцца. Вобразы атрымліваюцца не надта каб зыркімі і складанымі, але, тым не менш, глыбокімі і зразумелымі. Прытым не назавеш іх і аднастайнымі. А часам паэт дазваляе сабе і пэўнае панібрацтва на мяжы іранізму, і выглядае яно на дзіва натуральна і арганічна:

Радзімая ваколіца,
Зялёная гара.
А сонца торбай коціцца,
Паўнюткаю дабра.
(1982)

Асаблівую нотку драматызму працытаванаму твору, які на першы погляд падаецца вясёленькім — гэтакім сабе гімнікам захаплення простай радасцю маладога здаровага вясковага побыту, — дадае прысвячэнне Хведару Чэрню (1939—1983), беларускаму паэту, які заўчасна пакінуў гэты свет на 44 годзе жыцця, і дата напісання верша.

У ранніх творах выразна прасочваецца экзістэнцыя аўтара, які не аддзяляе сябе ад вясковага краявіду, глядзіць на свет праз вокны вясковай хаты і, стоячы пасярод поля, уросшы ў глебу каранямі айчынных дрэў, дакранаецца да аблокаў праз кашлатае голле і лістоту:

Хата анямелая, сівая,
З шэраю буслянкай, бы вянком,
Вокнамі задумна пазірае,
Склаўшы рукі на дзвярах замком.
(1980)

І менавіта з гэтага асэнсавання сябе як часткі навакольнага свету і зараджаецца ўсведамленне повязі з гісторыяй роднага краю. Назва аднаго з першых вершаў з адпаведнага поля гаворыць сама за сябе — «Францішак Багушэвіч»:

Ён сядзеў каля дарогі,
Як туман, увесь сівы.
— Бурачок, ты ж пахаваны.
— Дудка грае — я жывы.

— Падкажы мне, што іграці?
— Грай, што маеш на душы,
Толькі ад няшчырай песні
Дудку, браце, беражы.

Што да настраёвасці вершаў, то яе нельга назваць паўсюль роўнай. Дыяпазон вагаецца ад ціхамірнай заспакоенасці і філасофскай назіральнасці да неўтаймоўнага драматызму:

У фортцы ад ветру
разбілася шыба,
Пад столь занавеска сцюдзёна
трапеча.
У неба ўрастае галінамі ліпа,
У травы ўрастае туманамі вечар.
Як белыя птушкі, зляцелі паперы,
І стол апусцеў,
нібы бераг ад стрэлу.
Са злосцю на шум зачыніліся дзверы,
І стала падлога па-снежнаму белай.

Супрацьлеглым па настроі выглядае верш «Дарога да маці», дзе праз «закальцаванасць» — аднолькавы пачатак і заканчэнне — адчуванне драматызму яшчэ больш абвостранае і паглыбленае. Гэты вобраз можна назваць класічнай для нашага ментальнага поля метафарай тугі:

Далёкай зоркі
дрогкае святло,
Далёкай песні
сумнае гучанне.

Адметна, што, згодна з вынікамі даследавання айчыннай ментальнасці, мы «далучаныя» да космасу, альбо наасферы, праз неба, у адрозненне, напрыклад, ад іншых, прыналежных да яе праз геаграфічны распаўсюд ва ўсіх мажлівых напрамках. І ў гэтай сувязі зусім не падаюцца запазычанымі метафары і вобразы, што адсылаюць да «Лісця травы» Уолта Уітмена:

Пабялелі ад холаду пальцы травы,
І Дарогаю Млечнаю свеціць шаша.

У псіхалогіі шырока распаўсюджана практыка медытацыі, калі ў стане поўнага расслаблення чалавек канцэнтруе свядомасць на фізічных адчуваннях і паглыбляецца ўнутр сябе, літаральна «абмацваючы» знутры кожны куточак цела. Калі спалучыць медытацыю і паэзію, то цыкл «Хата» (з перыяду 1991—2001) можна назваць медытацыяй душы (а мы памятаем, што яна — частка айчыннага краявіду, вясковага і адначасна прыроднага). Цыкл складаецца з 13 вершаў: «Падмурак», «Сцены», «Дзверы», «Вокны», «Страха», «Гарышча», «Комін», «Падлога», «Столь», «Печ», «Парог», «Сенцы», «Ганак». Характэрныя метафары судакранання — зліцця — супранікнення двух аб'ектаў аднаго ў другі тыповыя для аўтара: мінімум сродкаў — глыбокі сэнс і вобразнасць: «сцены забіраюць у нас волю», «вокны зачыняем аканіцамі // нібы хаваемся ў сваё я», «і парог раздзяляе свет // на наш свет і запарожжа», «у сенцах кашы // як гнёзды». Нібы медытацыя, што пачынаецца з паступовага паглыблення ў сябе і завяршаецца мярудным вяртаннем «у тонус», «падарожжа» стартуе з падмурка і на выхадзе апынаецца амаль там жа — на ганку — «як на краі свету».

Гэткага ж узроўню медытатыўнага характару, але большага «геаграфічнага» абсягу з'яўляецца цыкл «Па дарозе да храма» (2007), што складаецца з 15 вершаў і «пранізвае» сэнсавымі «шуфрамі» гісторыю ад агню інквізіцыі і Вялікага Княства Літоўскага да сучаснасці, дзе сын, у якога няма маці, начуе ў вуллі пад аховай маткі пчалінай…

Для позняй аўтарскай манеры больш характэрна медытатыўна-замаўляльная форма «вандровак», дзе да галоўнага пасылу дадаецца шмат складаназалежных сказаў, і часам падаецца, што гэта не на карысць асноўнай ідэі: замест таго, каб «ісці ў глыбіню», яна «размываецца» праз нагрувашчванне розных дадатковых сэнсаў… Зрэшты, усё залежыць ад мэты: калі яна палягае не ў тым, каб «вычасаць» і акрэсліць яўнае з няяўнага, схаванага ад зроку, і зрабіць яго прыкметным, больш даступным для разумення, а ў самаспазнанні — то чаму б і не?.. Тым больш, калі яно — прамежкавы этап на парозе чагосьці больш маштабнага...

Яна БУДОВІЧ

Глядзіце / гледзіце гэты фільм…

Наша родная мова за больш чым стагадовы перыяд унармавання (калі лічыць пачатковым пунктам «Беларускую граматыку для школ» Браніслава Тарашкевіча, выдадзеную ў 1918 годзе) выпрацавала даволі ўстойлівыя граматычныя і арфаграфічныя нормы, якія часам знітаваныя і, як кажуць, «працуюць» у адной звязцы. Паказальным у гэтых адносінах можа стаць функцыянаванне дзеяслова *глядзець* і яго прыставачных / суфіксальных дэрыватаў (*паглядзець*, *гляджу*, *прыглядзецца* і інш.).

Сутнасць у тым, што парадыгма формазмянення залежыць ад выкарыстанага ў выказванні ладу дзеяслова. Так, формы 2-й асобы загаднага ладу пры націскным канчатку — *глядзі́*, *глядзіце* (адпаведна, *паглядзі́ся*, *паглядзіце́ся* і пад.), і тут, як і ў пачатковым дзеяслове, спрацоўвае закон якання (першы склад перад націскам): «Цёця Каця: Вы лепш *глядзіце*, каб ваша жонка не ўтрэскалася» (Кандрат Крапіва); «— Рады будзем — прыязджайце, *паглядзіце*!» (Іван Мележ); «А калі вам так закарцела паглядзецца, дык праз вуліцу жыве Урбан, цырульнік, у яго ёсць люстэрка, у два разы большае за вашу галаву: *паглядзіце́ся* ў яго, а пакуль — да пабачэння!» (Вільгельм Гаўф, пераклад з нямецкай Уладзіміра Папковіча).

У 2-й асобе множнага ліку абвеснага ладу пры націскным *-це́* корань апынаецца ў другім складзе перад націскам і, адпаведна, яканне не ўзнікае: *гледзіце́*, *пагледзіце́*, *пагледзіце́ся* і г. д.: «— А то калі ні прыйдзеш, вы ўсё ў кнігі *гледзіце*» (Якуб Колас); «— Тата, пасля выпіскі дома *нагледзіцеся*» («Звязда»). Такім чынам, напісанне дзеяслова падтрымлівае аўтарскую інтэнцыю, якая праграмуе правільны яго лад у выказванні і дапамагае наладзіць сумоўе з чытачом: «— Вы *паглядзіце*, што за пара: // Дальбог, нявеста і жаніх!» (Ніл Гілевіч) — загадны лад; «— А можа, заедзеце да нас?.. Клуб *пагледзіце́ся*» (Міхась Зарэцкі) — абвесны лад.

Вынікае, што абедзве вынесеныя ў загаловак нататкі формы дзеяслова *глядзіце* і *гледзіце* правільныя: «Вы ў адзіноце *гледзіце* фільм жахаў»; «Адна справа, калі трэба завязваць шнуркі, і іншая, калі вы седзіце цэлую гадзіну ці некалькі, нахіліўшыся да мабільнага тэлефона — *гледзіце* кіно ці чытаеце сацыяльныя сеткі» (абвесны лад); «Так, у суботу *глядзіце* фільм «Шукайце жанчыну» рэжысёра Алы Сурыкавай (1982 г.)»; «*Глядзіце* фільм па спасылцы ў сторыс» (загадны лад).

Узаемаразуменне і дыялог аўтар-чытач разбураюцца тады, калі змешваюцца формы ладу, памылковыя або праз арфаграфічную, або праз граматычную памылку, на што варта зважаць рэдактару або карэктару: «*Пагля*[*я*]*дзіце*, які прыгожы гузік: на сонейку пераліваецца»; «Якой прыгажуняй *гля*[*е*]*дзіцеся* вы ў белі сярод золата дрэў!»; «Вось чаму можна параіць: калі *гля*[*е*]*дзіцеся* ў люстэрка, думайце толькі пра добрае»; «Кожны раз, калі вы *гля*[*е*]*дзіце* фільм, вазьміце сшытак і аловак»…

Можа ўзнікнуць пытанне: чаму так шмат памылковых формаў *глядзіце́* (замест *гледзіце*) у абвесным ладзе? Па-першае, выяўляецца ўплыў дарэформавага (1933 г.) правапісу, калі ў падобным становішчы *я* пісалася і ў другім складзе перад націскам. Па-другое, наяўнасць у слове каранёвага *я*, якое не змяняецца ў любым складзе (у «Правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» сцвярджаецца: «Літара *я* пішацца ў некаторых каранях слоў нязменна»). Што ў слове *глядзець* каранёвае *я*, пацвярджаюць словы *глянуць* (*гляд+ну+ць*), назоўнікі *выгляд*, *погляд*, адпаведныя рускія лексемы. Верагодна, кадыфікацыя такой дзеяслоўнай парадыгмы зроблена менавіта з мэтай размежавання формаў загаднага і абвеснага ладу для адэкватнага ўспрымання падчас пісьмовых зносін. Бо любое замацаванне нормы — гэта своеасаблівая дамова носьбітаў мовы, прынятая дзеля найлепшага яе функцыянавання ў літаратурнай форме.

Таму кіруемся патрабаваннямі слоўнікаў і граматык і сочым за бытаваннем слова *глядзець*. І звяртаем увагу на такі, напрыклад, сказ з сучаснай інтэрнэт-камунікацыі: «Калі вы чытаеце электронны ліст, рэдагуеце дакумент Word альбо *гля*[*е*]*дзіце* фільм *Netflix*, пакідаць гэтыя праграмы для разліку і вяртання даволі нязручна».

Пятро ЖАЎНЯРОВІЧ

Да дзіцячага сэрца

Фота з асабістага архіва Ж. Міус.

Шлях у дзіцячую літаратуру для Жанны Міус быў няпросты. «Слава да мяне не раптоўна падышла і не падбегла, каб узяць і закружыць у зорным танцы. Яна, хутчэй, няспешным цікаўным смоўжыкам паўзла ціхенька насустрач. Праз гады і мары», — прызнаецца пісьменніца. Яна верыць у сусветны закон «мараспраўджвання» і ў тое, што наканаванае чалавеку не абміне. Жанна Міус расказала пра тое, як у яе атрымліваецца пакараць дзіцячыя сэрцы.

— Жанна Віктараўна, у вас вельмі гучны псеўданім. Раскажыце, што ён значыць і як узнік?

— Ідэя ўзнікла ў верасні 2018 года, якраз тады, калі я прыехала ў Выдавецкі дом «Звязда» зацвердзіць макет маёй першай дзіцячай кнігі «Странные детки». Я звярнулася з прапановай «апсеўданіміцца» да рэдактара аддзела кнігавыдання Вольгі Станіслаўны Рацэвіч. Насамрэч, не хацелася быць яшчэ адной пісьменніцай Усцінавай. Той, хто цікавіцца літаратурай, ведае, што ёсць аўтар Таццяна Усцінава, якая піша дэтэктыўныя раманы. Падумаўшы крыху, я вырашыла ўзяць па першым складзе з маіх прозвішчаў: дзявочага — Мінчанка і па мужу — Усцінава. Так атрымалася Міус. Коратка. Гучна. Весела. Тое, што і патрэбна, каб цябе адразу запомнілі маленькія чытачы.

— Як узнікла ідэя вашай першай дзіцячай кнігі? Чаму прыйшлі да напісання твораў менавіта для дзяцей?

— Творы для дзяцей я пачала пісаць задоўга да таго, як пабачыла свет мая першая кніга. Рукапісы з вершамі і казачнымі гісторыямі адсылала ў розныя выдавецтвы, але, не атрымаўшы адказу, сумелася, на некаторы час кінула спробу пакараць кніжны свет. У 2017 годзе нечакана напісаўся верш «Лохмарик-Шуршарик, или О том, кто шуршит в темноте под детской кроватью». А затым узнікла ідэя напісаць цэлую кнігу пра розныя дзіцячыя дзівацтвы. Так узніклі мае жартоўныя слоўцы: «смехава́рыя», «белібердомік», «слязлівень», «капрызасос», а пад іх склаліся і самастойныя гісторыі пра непаўторны і чароўны свет дзяцінства. Ніколі не забуду той памятны дзень, калі я атрымала ліст з выдавецтва, а ў ім — запаветныя словы: «Мы плануем выданне вашай кнігі…» Дарэчы, я нарадзілася 18 студзеня. Першая кніга выйшла ў 2018 годзе, і ў ёй было… ну, канечне, 18 вершаў! Вось такая магія лічбаў...

— Як з'яўляюцца героі, вобразы? Дзе чэрпаеце натхненне?

— Бываюць дні, калі працуецца лягчэй, бываюць — калі цяжэй. Асабліва гэта тычыцца вершаў. Вершы — як людзі: кожны з норавам. Адзін, глядзіш, выскокваe з галавы вясёлы, задзірлівы з воклічам: «Іх-хей!» А другі — «ныцёна», паўзе ледзь-ледзь, з натугаю… Круціш яго і так, і гэтак — а воку і слыху ўсё роўна няўежна, смак не той. Дык тут выхад адзін — адкласці і даць твору выспеліцца. Пры другім заходзе, упэўнена, усё «завяршу́ецца», як трэба! Як узнікаюць ідэі, героі, вобразы? Па сакрэце скажу: прыходзіцца ўвесь час падслухоўваць і падглядваць. Гэта жартам, а калі сур'ёзна: у дзяцей такая фантазія глыбезная — ні адзін дарослы, з развітой здольнасцю прыдумляльніцтва, пісьменнік не зможа туды занырнуць. Вы бачылі выстаўкі дзіцячых малюнкаў? Там такія неверагодныя ідэі! Такія цуд-героі! Шкада, што дзеці не могуць усё, што яны прыдумляюць, скаласці ў згрэбную, чытэльную гісторыю. Вось таму Бог і прыдумаў пісьменнікаў.

— Часта пісьменнікі пішуць для канкрэтнага чытача. Вы таксама? Якой бачыце сваю аўдыторыю?

— Я пішу для сучасных дзетак. Для тых, да каго хаджу на творчыя сустрэчы, каму зазіраю ў цікаўныя вачаняты. Як толькі ў мяне нарадзілася першая кніга, пачаліся пастаянныя вандроўкі па школах і бібліятэках Магілёва. Апошнія паўгода выступаю перад маленькімі чытачамі разам з узорнай тэатральнай студыяй «У кропку!» (Магілёўская ДШМ № 1). Кіраўнік студыі Вольга Юр'еўна Бялова стварыла па матывах трох маіх дзіцячых кніг цікавую забаўляльную праграму пад назвай «Прызямліліся канікулы». Уявіце сабе шумлівае мора з сямі параленяў першакласнікаў. Прыкладна сто пяцьдзясят «неўсядзю́ох» і «балбатуль» у адным месцы — у актавай зале. Дык вось, калі на сцэне пачынаецца спектакль з вясёлымі вершаванымі гісторыямі пра дзвюх нясумных дзяўчынак, якія робяць мэйкап соннаму тату, шыюць новы ўбор ляльцы… з матулінай сукенкі альбо малююць камічны сямейны партрэт — шум адразу заціхае. Дзеці пачынаюць паглыбляцца ў аповед, які яны агучваюць прыкладна так: «Ого, дык гэта ж пра мяне!» Асабіста для мяне зваротная сувязь са сваім чытачом — жыццёва неабходная рэч.

— Як лічыце, ці кожны пісьменнік можа стаць дзіцячым? Існуе меркаванне, што пісаць для дзяцей больш складана. Ці так гэта?

— Так! Часта аўтары пішуць «нібытадзіцячую» кнігу, насамрэч не заўважаючы, што яна адрасавана… дарослым. І стыль, і тэматыка далёкія ад сучаснасці. Лічу, калі пісьменнік даўно не дазваляў сабе дзіцячых учынкаў, схаваўся за шкарлупінаю сур'ёзнасці і сталай разважнасці, у яго наўрад ці атрымаецца годны твор, шчыры, цікавы, той, што можа працяць наскрозь і пакінуць пякучы след у маленькім сэрцы.

— Наколькі сучасных дзяцей цікавіць кніга? Як вы атрымліваеце водгук пра свае творы?

— Кніга была, ёсць і будзе! Час змяняе модныя забаўлялкі ў руках дзетак, але, калі знаёмяцца з цікавай кнігай, у іх і зараз нязменна загараюцца вачаняты. Я творча сябрую, калі можна так сказаць, са школай № 19 Магілёва. Была там ужо тройчы. Апошні раз з вялікім стосам сваіх кніг, якія дзеці захацелі набыць… А нядаўна на свяце да Дня абароны дзяцей, якое традыцыйна праходзіць у магілёўскім Падніколлі на беразе Дняпра, я на кніжнай сустрэчы пачула такі водгук: «Жанна Віктараўна, вы год назад у бібліятэцы імя А. Пушкіна падарылі мне сваю кнігу. Ведаеце, я яе ўжо тройчы перачытаў… Цікавая… Яна заўсёды падымае мне настрой. Дзякую вам за такі падарунак…» Шчыра кажу: я ледзь не расплакалася…

— І традыцыйна: якія творчыя планы? Над чым працуеце зараз?

— Гэтай зімою рускі літаратурны цэнтр у Маскве зацікавіўся маёй казачнай гісторыяй «Размаўлюнкі маленькай Валюнькі». Як вынік — публікацыя ў альманаху «Tangue», што выходзіць для прадстаўлення рускамоўных аўтараў на еўрапейскім кніжным рынку. У сувязі са склададанай палітычнай сітуацыяй цяжка прадказаць вынікі такога прадстаўлення, але для сябе я ўжо птушачку паставіла: твор неблагі, зацікавіў дасведчаных людзей, калі яго захацелі прапанаваць замежным выдаўцам. Зараз рукапіс гэтага твора разам з іншымі вясёлымі гісторыямі знаходзіцца ў Выдавецкім доме «Звязда». Спадзяюся, займальны гумарыстычны аповед пра малюнкавых персанажыкаў: котабалерыну Ірыску, ружовага пяшчотазаўра Кулёму і мажную Гарбу́зу Награ́дкаўну дойдзе да маленькага беларускага чытача.

Гутарыла Дзіяна КАЗІМІРЧЫК

Словы-наватворы

Арыгінальныя героі, непрадказальныя гісторыі, яркія сюжэты, маляўнічыя вобразы... Усё гэта датычыцца творчасці дзіцячай пісьменніцы Жанны Міус, якая піша запамінальна. Але галоўнае, чым аўтар прыцягвае ўвагу да сваіх твораў, гэта цікавая, сакавітая мова і аўтарскія неалагізмы. Жанна Міус з самых першых старонак вабіць чытача словаўтварэннямі і запрашае ў дзіўны свет. Кнігі «Дзіўныя дзеткі» і «Малёк Удалёк і Жах-Рыба», якія выйшлі ў выдавецкім доме «Звязда», змогуць пазнаёміць чытача з творчасцю пісьменніцы.

У казцы «Малёк Удалёк і Жах-Рыба» маленькі чытач разам з адважным Мальком Удалькам і яго сябрамі Малёршыкам, Малязікам і Малёкунем можа адправіцца ў падарожжа па Чароўным возеры. Першы прыпынак «Незвычайны рыбсадок», дзе жывуць тры рыбкі і іх выхавальніца старэнькая Ахаўна, якая сваё імя атрымала праз тое, што заўсёды ахала ды вохкала. Удзень Малязік, Малёршык і Малёкунь слухалі расповеды Ахаўны пра ўсялякія цікавосткі свету, а пасля знаходзілі забаўкі каля вялізных раслін на водмелі. Пасля знаёмства з Мальком Удальком у рыбак пачаліся сапраўдныя прыгоды.

Далей чытача чакае знаёмства з джунглямі-непрахаджунглямі, спадарыняй Страхп'ю — пунсовай п'яўкай, якая жывіцца дзіцячым жахам і адчаем, навінатарам і Жах-Рыбай. З апошняй пачварай рыбкі-сябры выратоўваюць змагацца. На гэтым шляху можна пазнаёміцца з двурыбам Сюдыкусам-Тудыкусам, цудадрэвам Усяпрытулам, павуком Пяцелькам і іншымі дзіўнымі героямі. Ідучы разам з імі, здзіўляешся паваротам фантазіі пісьменніцы і таму, наколькі дарослага чытача захапляе сюжэт. Хочацца вярнуцца ў дзяцінства і пражыць гэтае маленькае жыццё з героямі з яшчэ большым запалам і спектрам эмоцый. Цудоўныя ілюстрацыі мастачкі Святланы Стахоўскай дапамагаюць чытачу акунуцца ў падводнае царства. Радуе таксама, што жывая аўтарская мова з каларытнымі слоўцамі далучае маленькага чытача да роднага слова.

Пасля таго, як чытыры рыбкі знішчылі Жах-Рыбу, пісьменніца падсумоўвае: «Зло немагчыма знішчыць назусім. Можна з ім змагацца і часова перамагчы, пры ўмове, што час ад часу будуць з'яўляцца смелыя і адчайныя малькі ўдалькі... Ёсць вялікае і магутнае слова "раўнавага". Яго шэпчуць зіхатліўкі-зоркі ў неабсяжным Сусвеце — прыслухайся як-небудзь уночы... Так сказала залатая рыбка ў акварыуме невялічкай утульнай кавярні. Гэта яна распавяла мне дзівосную гісторыю пра адважнага Малька Удалька і пачварную Жах-Рыбу».

Галоўнае, чаму вучыць казка, — зло спараджае яшчэ большае зло. Трэба знаходзіць сілы і мужнасць з гэтым злом змагацца. Такі закон жыцця — і падводнага, і зямнога.

Кніга «Дзіўныя дзеткі» — вершаваная, складаецца з 18 вершаў-гісторый. Яна будзе цікавая тым, хто хоча даведацца, дзе знаходзіцца Салодкасонне, адкуль у кватэры з'яўляецца слязлівень, што такое смехаварыя, капрызасос і ўхахотка. І гэта толькі частка цікавых слоўцаў! Чытача чакае знаёмства з незвычайнымі героямі гумарыстычных вершыкаў, кожнага з якіх можна назваць дзіўным дзіцём. І гэтыя мілыя, пацешныя, бяскрыўдныя дзівацтвы хтосьці можа пазнаць у сабе самім.

Верш Жанны Міус «Лахмарык-Шуршарык, ці Пра тое, хто шуршыць у цемры пад дзіцячым ложкам» стаў імпульсам для стварэння «Дзіўных дзетак». Гэта першая дзіцячая кніга пісьменніцы. Сама аўтар адзначае, што пацешныя вершаваныя гісторыі нараджаліся вакол жартоўных слоўцаў. Як, напрыклад, у вершы «Слязлівень, ці Пра бясконцае маміна цярпенне»:

У Кирюшеньки в квартире
лил безудержный слезливень:
раскапризница-гроза
дала волюшку слезам.
Полчаса Кирилл проплакал:
не желал стричь ногти так он.
Истеричных слёз поток
удержать не мог платок.

У кнігах апісана шмат цікавых гісторый з дзяцінства пісьменніцы і з яе дзённікавых запісаў пра пацешныя выкрутасы сваіх дзяцей. Жанна Міус — наватар ідэй у дзіцячай літаратуры. Творы пісьменніцы дораць чытачу цудоўны настрой. Вершы з кнігі «Дзіўныя дзеткі» маленькі чытач можа асвойваць самастойна, трэніруючы дыкцыю.

Варта таксама адзначыць яркі ілюстратыўны рад кнігі, які стварыла мастачка Аліна Прастак. Шматпланавыя малюнкі цудоўна дапаўняюць вершаваныя гісторыі і даюць чытачу вялікае поле для фантазіі.

Кнігі «Дзіўныя дзеткі» і «Малёк Удалёк і Жах-Рыба» — цудоўная магчымасць адкрыць для сябе творчасць Жанны Міус, пазнаёміцца з яе неверагоднымі фантазіямі, увасобленымі ў вершыках і казках. Яны стануць сапраўднымі сябрамі для маленькага чытача, бо з імі весела і пазнавальна.

Дзіяна КАЗІМІРЧЫК

Таццяна КАЛЕНІК

Вярнуцца…

Паспяваючы
за ўпэўненым крокам Сучаснасці,
не спазніся
пачуць,
аб чым вядуць гутарку
цені жанок ля плятня,
пакуль яго спарахнелыя рэшткі
не аддалі на забыццё;

зачэрпнуць
чысты водбліск зорак,
пакуль калодзеж,
у якім пакідаюць яны на досвітку
прывітанне чалавеку,
не паспела атруціць
чалавечая паспешлівасць;
пакуль не прымусілі сціхнуць навуку
бабуліных кроснаў,
вярнуцца…
да самога сябе.
Табе ткаць абярэг,
якім уратуеш ты родную крынічку
ад упэўненасці крокаў.

Зямная навука

Здзейснілася мара дзяцінства,
стаю на краі зямлі…
Так і ёсць: за беражком —
зорны россып у неабсяжнай прасторы,
Там — незямной чысціні святло,
Да якога мы так імкнуліся патрапіць,
пэўна,
Далей ад хлусні дарослых.
«Краю зямлі не існуе», —
сцвярджалі некаторыя з іх.
Цяпер я ведаю: яны не хлусілі.
Яны паўтаралі тое, чаму іх навучылі тыя,
Хто іх навучыў
Хлусіць.
Навучылі…
І яны перасталі марыць.
І яны перасталі думаць.
Яны
перасталі…

Хтось маўчаў. Не ведалі, што сказаць.
Аднак гэта падбухторвала
на вялікія пошукі.
І толькі дзівакі,
на якіх круцілі пальцам каля скроні,
Упэўнівалі: «Шукайце і знойдзеце».
І мы пайшлі, благаслаўлёныя
Дзівакамі.
Ім чамусьці хацелася верыць.

Тады мы не ведалі,
што шлях будзе доўгім і цяжкім.
Хлусня дарослых —
нібыта каменныя кайданы на нагах,
Нібыта ланцугі, якія ўеліся ў крылы,
Скавалі грудзі.
А хацелася дыхаць.
А хацелася крочыць
Вольна.

Дзе дзеліся сябрукі, не ведаю.
Кожны пайшоў сваім шляхам,
А я вось…
Прыйшла.
І ўжо раскрыла б крылы,
Ды ланцугі не пускаюць,
Ды кайданы цяжкія.
Не адпускае
Навука зямная.

Чаму кацянят становіцца меней?

Ці бачылі вы,
як жнівеньскія яблыкі
свецяць цяжарным зоркам?
…Таму і хіляцца голлем да самай зямлі
яблыні,
трымаюць вагу наліўных ліхтароў,
пакуль шукаюць прытулак
пад іхнымі шатамі
зорныя прыхадні.
Ці чулі вы,
як падаюць зоркі ў ваш сад?
Як, адарваўшыся ад галінак,
стомлена падаюць побач
іх пуцяводныя агеньчыкі — яблыкі?
Аб чым жа шэпчуцца яны
падчас вокамгненнага спаткання,
ці чулі вы?
Ці бачылі...
як нараджаюцца зорныя немаўляты?
Як дагарае маці-звязда?
Як на плач асірацелых
нованароджаных
спяшаюцца спагадлівыя коткі?

…Не спыняецца жыццё нябесных дзетак
пад кашлатымі чэравамі
тутэйшых матуль!
Галубяць яны малых
цёплымі языкамі,
падсілкоўваюць моцай
зямных таямніц
і не ведаюць,
што зноў і зноў
расквечваюць сувоі міжпланетнага
бязмежжа
зорным ззяннем,
што запальваюць і запальваюць
ураджай духмяных ліхтароў
у вашым садзе.
Багіні жыцця…

Як спыніць ім цябе, чалавек,
каб незнарок, у пагоні за прыгажосцю
ўласнага існавання,
не спыніў ты
бясконцы кругаварот жыцця?

Ігар ПРАКАПОВІЧ

На астравах

Ты чула, што ёсць астравы,
Дзе людзі не ведаюць зла?
Там пахі духмянай травы,
Там ціша спакоем лягла.

Там водзяць яшчэ карагод
Русалкі ў летняй начы.
Туды я з'язджаю штогод,
Каб зёлкамі сэрца лячыць.

Там рай у душы і спакой.
Салодкая спее хурма.
Там добра было б нам з табой,
Ды толькі цябе там няма…

* * *

Агонія пачуццяў…
Гэта — жах!
Як перажыць?
Як жыць пачаць нанова?
Якая кволая ўсё ж такі душа:
Не білі-катавалі —
Толькі слова…
І ўжо… Ты ведаеш,
У сутаргах яна
Адчайна б'ецца…
І няма ратунку.
І ўсё гарыць.
На свеце — землятрус,
І разышлася без краёў паводка.
І дзе раміза?
Дзе надзейны шлюз?
Ці хоць які каўчэг…
Ці хоць бы лодка…

* * *

Зноў трызняцца чэрці
і розная нечысць,
Злы дух да аорты прыпаў.
І сон, як нямая глухая бязмежнасць, —
Хоць рулю да скроні прыстаў…

Пустэча і сум у касмічных прасторах.
Аб літасці Бога прашу.
А там, каля Месяца,
промнямі зорак
Маю распінаюць душу…

* * *

Вечарам позна з крамы
Прыйдзе мужык п'яны,
Будзе крычаць, што жонка
Зламала яму жыццё.
Траіх нарадзіла дзевак,
Злюбіцца з другім паспела…
І ўвесь гэты свеце белы
Сыплецца, як лісцё…

…Ці чуеш ты, п'яны татка,
Як плачуць твае дзяўчаткі,
Як плача жанчына тая
У любасці — не ў кляцьбе.
Няма ў яе нікога,
Адна ў жыцці дарога,
Ідзе яна ёй да Бога
І моліцца за цябе…

Фота Каспуся Дробава.

Яўген ГУЧОК

Запісная мая кніжка

* * *

Запісная мая кніжка
Не змяшчае адрасоў
Самых верных, самых блізкіх,
Самых выбраных сяброў,

Бо яны ў яе не лезуць
Ані гэтак, ані так,
Як размесціш там гарэзу —
Вецер, Сонца там размесціш як?

* * *

Ахіну я шыю маем
І па студзені пайду,
І нішто не затрымае
Маю лёгкую хаду.

Леваруч мне Слуцак будзе,
Ну а справа — Млечны шлях.
Вы святлей жывіце, людзі,
Каб не згінуць у вяках!

* * *

Радасць майму сэрцу,
Светласць галаве:
На маім балконе
Ластаўка жыве.

На маім балконе
Неба больш штодня,
Носіць яго й носіць
Новая радня.

А яшчэ вось хутка
Ластаўняткі будуць,
Яшчэ болей неба
Для мяне здабудуць.

Радасць майму сэрцу,
Светласць галаве:
На маім балконе
Ластаўка жыве.

* * *

Не трэба мне вішні,
Не трэба чарэшні,
Лячу на сустрэчу
З прыгожым, амаль што бязгрэшным.

Сама я такою буду
Як ён.
І ўзыдзе над намі
Зорак мільён.

Не проста узыдзе —
Рассыпле Усявышні
Найлепшыя ў свеце
Чарэшні і вішні.

* * *

Мне падае на душу з неба меса,
І восеньская плавіцца імгла,
А ў лесе захавалася пралеска
Ад той вясны, што так даўно прайшла.

Самотная, цнатлівая, амаль святая,
Схіляю перад ёю галаву,
І маладосць шчымліва ўспамінаю,
І нанава нібыта я жыву.

Аскепкі твораў мастацтва і маіх фантазій

Вольга РОПАТ

Яна

Арт-аб'ект з праекта «Асабістыя рэчы» Ганны Сілівончык (фрагмент)

У дзверы пастукалі.

Яна размясцілася ў крэсле насупраць. Глядзела на мяне. Доўга.

— Вы мяне не пазнаяце?

— Не.

Яна не ведала, з чаго пачаць размову. Пачала я.

— Раскажыце, як вы правялі раніцу.

— Раніцу? *(Я кіўнула.)* Раніца… Адчуванне цяпла. Здавалася, знаходжуся ў коканe… Затым агарнула ранішняе паветра.

— Ведаеце, чаго не люблю?

Зацікавілася. Паглядзела ў вочы.

— Не люблю халодную падлогу. Асабліва плітку. Здаецца, раніца ўжо за нешта пачынае помсціць. Яшчэ не люблю першыя кроплі халоднай вады. Яны раздражняюць мяне — адразу ж накочвае хваля дрыжыкаў, абурэння, хоць наступныя секунды прыносяць задавальненне... *(змоўкла)* цеплыня выслізгвае, нібы нябесны шаль з тонкай шыі. У ранішнія гадзіны ванная нагадвае «Шэпты і крыкі» Бергмана. Хочацца адгарадзіцца ад безаблічных шаблонных галасоў.



Вада льецца празрыстым стрыжнем. Цяплей... яшчэ цяплей. Любімы момант — кантакт з мылам. Гладкае, мяккае, авальнае мыла так пяшчотна датыкаецца, пакідаючы духмяны водар. Думаю, у раніцы тоіцца нешта цнатлівае, некранутае…

— Што прыносіць вам задавальненне днём?

— Гэта не мой час. Час перайманняў. Масак. За што можна любіць дзень?.. Можа, за тканіны?.. Так, за тканіны. Воўна — мяккая, цёплая... Утульная. Надзейная. Як дотык каханага чалавека, з якім доўга жывеш. А шыфон, атлас — палюбоўнікі. Кранальныя, мімалётныя, лёгкія. Свабодалюбівыя. Але я не крыўджуся. Мне, наадварот, падабаецца гэтая свабода, незалежнасць. Напэўна, вы зараз спытаеце пра вечар?

— Вы маеце рацыю.

— Увечары я вызваляюся. Гэтыя пагладжванні, дотыкі... клапатлівыя, далікатныя, грубыя, непрыемныя… Мне хочацца ачысціцца…

— Калі вам некамфортна, можаце не працягваць. Давайце спынімся на сказаным. Мне гэтага будзе дастаткова.

— Не! Мне хочацца… Я вельмі жадаю расказаць!

— Выдатна. Можам працягнуць размову.

— Для мяне ноч — час асаблівы. Час дотыкаў, але яны іншыя, не такія, як удзень. Час розных адчуванняў. Наўрад ці я змагу цяпер апісаць усе адчуванні... Вельмі люблю цяпло. Асабліва першыя хвіліны, калі халодная скачу ў ложак і грэюся пад коўдрай… Потым — прыліў цяпла, здаецца, што знаходжуся дзесьці ў глыбіні, у западзіне, дзе ўсё кіпіць, прагне чагосьці... холад пранікае праз вузкі прасвет і цалуе мяне. Тады ахопліваюцца дробныя, рассыпістыя дрыжыкі. Дрыжыкі яшчэ з'яўляюцца ад вуснаў і падушачак пальцаў…

(змоўкла)

— Гэта ўсё, што вы хацелі сёння расказаць?

— Напэўна, так.

— Добра. Вас запісваць на заўтра?

— Так. Запішыце, калі ласка.

— Скажыце імя.

— Скура.

Шкляны дождж

Сяргей Белаокі «Падаў дождж»

Сквер — дом жоўтых клёнаў. Лісце клёнаў — зоркі, якія даюць шанц на здзяйсненне мары. Лісце так і просіцца на выстаўку: чырвоныя, вохрыстыя, бурштынавыя плямкі змяшаліся на іх, як на палітры мастака. Знаходзіла і жоўтае лісце з чорнымі кропкамі і графічнымі узорамі — відаць, працаваў графік. Некаторыя ўзоры нават нагадваюць японскі жывапіс — мінімалістычны, адухоўлены, жывы.

Дрэвы яшчэ дыхаюць восенню. А я — калекцыняпрую пахі восені. Пахі сырых дрэваў, навіслыя, як старое павека, аблокаў. А калі глядзіш у акно — усё муляж. Усё шэрае і пастэльна-сіняе. Скураныя лялькі спрабуюць паказаць важнасць сваіх дзеянняў. На вуліцы — іншае адчуванне.

Канцэнтруюся на колерах і гуках. Вецер разносіць галасы пыльных аблокаў. Збіраю гэты скарб, нібы ў апошні раз. Мабыць, вы не так зразумелі… Восень ніколі не паўтараецца. І дзень ніколі не паўтараецца двойчы. Раней думала: аднолькавыя дні, плагіят... копіі фотаздымкаў. Але не.

Зараз мне нічога не замінае. Павольна іду па сталічным скверыку. Думкі мае схаваны, як мышы, і выйдуць ужо ў кватэры з адным маркотным акном.

Шшшух!

З неба ўпала шкляная фігурка. На ёй — узоры, быццам манікюрнымі нажніцамі выразаны іерогліфы. Падняла галаву — вісіць шэрае воблака, як самаробная цацка з ваты.

Вецер хвалямі накідваецца на твар, а каляровае лісце клёнаў — на чырвоныя чаравікі. Сквер шамацеў, перашэптваўся, штосьці пстрыкала, галіны пад нагамі трашчалі і нагадвалі гук кастра.

Шшшух!

Яшчэ адна прамавугольная фігурка прызямлілася каля мяне. Але на ёй — іншы узор — больш экспрэсіўны. Фігуркі крохкія, але не ламаюцца, калі на іх націснуць. Адчыніліся дзверцы і спусцілася з воблака вяровачная лесвіца — мне запрашэнне. Хтосьці з воблака крыкнуў:

— Хадзем! Я раскажу, як робіцца шкляны дождж!

Што тут зробіш? Адмаўляцца ад такога падарунка ў звычайны восеньскі дзень? Не! Цуд, ды і толькі…

Паднялася да воблака па лесвіцы. Мяне сустрэў высокі спадар у белай вопратцы ў футурыстычным стылі. На твары — вялікія гранёныя акуляры ў серабрыстай аправе. Абутак яго — таксама серабрысты, але з нейкімі напісанымі чорным колерам іерогліфамі.

— Спадар Белаокі, — працягвае ён светлую і халодную як мармур руку.

Унутры воблака ўсе амаль паўпразрыстае. Белыя толькі мальберт, стол, крэсла.

Ён заварыў мне гарбату з мелісай і рамонкам. Самае любімае акрамя стварэння скульптур — заварваць гарбату. Павольна. У цішыні. Назіраць за парай і адчуваць водар зёлак. Спадар Белаокі прызнаўся, што гарбата — адзінае, што набліжае яго да зямлі і ўвогуле ўсяго зямнога. Тут, на аблоках, ён чуе зусім іншыя водары і гукі. Для спадара белы колер — сусвет, кропка адліку.

— Які колер самы шчыры? — спытаўся мой новы знаёмы.

— Белы?

— Празрысты, — адказаў творца. — Празрыстыя — усё жыццё, уся праўда.

Гарбата ў кубачку — адзінае, што мела колер у майстэрні-воблачку. Колер сонная сонейка.

Творца прызнаўся, што шкляны дождж падае толькі раз на пяцьдзясят гадоў. І таму, хто зловіць дзве шкляныя кроплі, будзе шанцаваць усё жыццё. Майстар доўга назіраў за маімі дзеяннямі з воблака і вырашыў зрабіць падарунак у звычайны восеньскі дзень.

Медузы ў шкле

Вольга Сазыкіна «Дзявочыя капрызы»

Учора прачнулася ў добрым настроі. Такое здараецца рэдка.

Цёмныя хмары, мітуслівы дождж, вецер, зноў дождж.

І сёння прачнулася ў добрым настроі.

Цёмныя хмары, мітуслівы дождж…

Але надвор'е — нішто ў параўнанні з маім сном.

* * *

А снілася вось што. Плаваю ў глыбокім сапфіравым моры, а каля мяне — медузы з тканіны. Прыгожыя, з узорамі вышытымі. У гатэлі папярэдзілі, што гэтых медуз можна гладзіць — яны добрыя. А калі вынесці на сушу — пакрываюцца празрыстым шклом і застываюць у дзівоснай позе, быццам у танцы. Такія марскія сувеніры можна прывезці і дадому — бачыла, як вялізнымі сумкамі выносілі. А колькі кожны дзень адзін турыст выносіць?! Жах.

Я таксама вырашыла ўзяць. Адразу тры. Дзе у Мінску знойдзеш медуз у шкле?..

Паставіла на самае ганаровае месца ў пакоі (на тумбу, што насупраць акна). На сонцы скульптура пераліваецца агеньчыкамі, колеры танцуюць, зайчыкі па сценах бегаюць. Прыгажосць!

Прыйшла ў госці сяброўка паглядзець на медуз з тканіны ў шкле. І разбіла адну скульптуру. Разлавалася на яе. Як жа так! Везла з далечыні гэтыя крохкія стварэнні, праціралі іх ад пылу. А яна…

Але нас чакала яшчэ адно ператварэнне: замест медузы — блакітна-белая сукенка з вышыўкай, ды яшчэ майго памеру.

Вось цяпер зразумела, чаму гэтыя скульптуры жанчыны выносілі ў вялізных чаманах… А я думала, мастацтва любяць…

Дворык у вішнёвым сіропе

Архітэктура

Мой дзень нараджэння выпаў на сераду, але святкаваць вырашылі з мужам у суботу.

Пасядзелі у рэстаране, паелі смачныя ролы з тунцом ды ласосем, выпілі белага віна. І ўсё б нічога, калі б мне не прыйшла ідэя пайсці ў Чырвоны дворык і яшчэ ў «Сіняй казе» выпіць кактэйль.

Сцямнела. Каляровыя дамы на Нямізе — бутафорыя, дэкарацыі да спекталя з ананімнымі акцёрамі. Наш рэстаран у малочнай колеравай гаме — адзіная светлая пляма на вузкай вуліцы, якая паспела выкупацца ў сіняй акварэлі (вечар — акварэль, а ноч — ужо акрыл). Майстар дакрануўся пэнздлем да вокнаў — з'явілася апельсінавае святло. З'явіўся і жоўты: яркія плямкі паскакалі па трохпавярховых будынках.

Насустрач — танклявыя сілуэты жанчын, мініяцюрныя, вытанчаныя, як флейты ды скрыпкі. Глядзі, якая прыгажуня! І галасы іх расплываюцца па Нямізе як гукі музычных інструментаў. Сілуэты мужчын нагадваюць бутэлькі з дарагімі напоямі. Калі сабраць усіх мужчын з суседніх вуліц ды куткоў Нямігі, яны нагадаюць бутэлечны нацюрморт. Высокія, нізкія, пузатыя, доўгія, маленькія, вытанчаныя... Хтосьці паўпразрысты прабег — маленькі, светлы і худзенькі. Нямігa ўвечары — клубок гукаў, смеху, паху парфумы, бразгання біжутэрыі, дыму, музыкі, крыку. Гэты згустак паглынае, варышся ў ім нейкі час, а потым прыходзіць разуменне: ты — адзінокі. Адзінокі ў натоўпе. Няма «містычнага адзінства», ёсць — адзінота. Крыху салодкая, крыху мятная… Здаецца, прыемная. А потым паходзіш — усё ж такі непрыемная… Лёгкая, як вэлюм, пакута.

Вокны, святло, сілуэты. Музыка, пахі, смех. Моманты, сустрэчы, гісторыі.

Вось і прыйшлі.

Чакаем кактэйлі. Сядзім як шкляныя скульптуры. Глядзі, кажу мужу, сёння фарба на будынках ў Чырвоным дворыку неяк па-іншаму блішчыць. Прабег позіркам па чырвоных будынках, паціснуў плячыма. Не, я не памыляюся — сёння яны іншыя! Прыглядаюся — магутныя будынкі паступова робяцца празрыстымі, але вішнёвы колер застаецца. Я падышла да дзвярэй і адламала ручку (мяне нават ніхто не заўважыў, бо прысутныя скульптуры весяліліся, пілі ды сядзелі ў тэлефонах). Шкляную вішнёвую ручку. На смак — салодкая, як лядзяш, смачней за барбарыску. Вы паглядзіце! Чырвоны дворык у адзін момант стаў вішнёвай цукеркай. Я даўно мужу казала, што Чырвоны дворык абліты вішнёвым сіропам — яго магнетычны бляск так і вабіць не толькі турыстаў… Але хто мяне слухае?..

Найбольш рэдкія экзэмпляры, пачынаючы ад гліняных таблічак, пальмавых лістоў і пергаменту, з сусветнай і айчыннай кніжнай спадчыны прадстаўлены на выстаўцы «100 рарытэтаў: ад гістарычных кнігазбораў да сучасных арт-кніг», што нядаўна адкрылася ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі да знакавай юбілейнай даты. Ідэя часовай экспазіцыі ў тым, каб да стагоддзя ўстановы прадэманстраваць сто найкаштоўнейшых унікальных помнікаў, што прадстаўляюць і гісторыю фарміравання бібліятэчнага фонду — найлепшае з назапашанага за 100 гадоў. Фонд рукапіснай рэдкай старадрукаванай кнігі на сёння налічвае больш ад 100 тысяч адзінак — стваральнікі імкнуліся прадставіць максімальна поўна тое, што ўдалося набыць і навукова ідэнтыфікаваць за апошнія гады. Шэраг экспанатаў дэманструецца ўпершыню.



Кніга Святога Іова. Выданне Францыска Скарыны. Прага, 10.09.1517 г.

Скарбы, пакінутыя папярэднікамі

Пачынаецца выстаўка з найбольш ранніх форм кніг, выкананых на папірусе. Сярод іх — факсімільнае ўзнаўленне манускрыпта «Папірус Бадмера 8». Адзін з найстаражытнейшых біблейскіх тэкстаў, арыгінал якога датуецца III—IV стагоддзямі і захоўваецца ў Ватыканскай апостальскай бібліятэцы, узноўлены па сучасных тэхналогіях. Побач — скруткі ў розных варыянтах, формы кнігі кодэкса — не больш ад стагоддзя таму, а ўчора. Не зусім звыклая для нашай традыцыі і папера: яна створана з лапікаў — паўтканіны-паўцэлюлозы, выдатна захавалася. Усходняя традыцыя назіраецца ў акладах і пераплётах. Так, пераплёт не быў цвёрды, адсутнічалі і зашпількі. Спецыяльны клапан зачыняў рукапіс, надрадковыя пазнакі, што ўскладняюць чытанне. У выданнях Скарыны ўжо ў наяўнасці друкаваныя ініцыялы, — ён адзін з першых у Еўропе пачаў рабіць адрознымі вялікую і малую літары — для іх створаны адметныя шрыфты. Гравюры ў прадстаўленым выданні, верагодна, былі зроблены па скарынаўскіх эскізах. Каштоўны экспанат набыты ў 1925 годзе ў санкт-пецярбургскага калекцыянера.

— Падчас вайны, дарэчы, была спроба вывезці выданні Скарыны з Беларусі, але пашанцавала адшукаць вагоны, дзе былі змешчаны каштоўныя кнігі, — распавядала Марыя Шопіна.

З адметнасцей, прадстаўленых на выстаўцы — адна з самых вялікіх кніг — факсімільнае ўзнаўленне 1972 года выдання Джэймса Адзюбона «Птушкі Амерыкі» памеру амаль метр на метр. Арыгінал канца XIX стагоддзя, па словах экскурсавода, з'яўляецца самай запатрабаванай і самай дарагой кнігай свету. Птушкі тут адлюстраваны ў натуральную велічыню. Аўтар быў арнітолагам, які першы пачаў замалёўваць пярнатых. Доўга шукаў, хто выгравіруе замаляваныя ад рукі выявы. Цяпер некаторых птушак толькі і можна пабачыць пад вокладкай гэтай кнігі...

Побач з самай вялікай кнігай выстаўлены і мініцюрныя. Адзін з экспанатаў — мікракніга 1985 года маскоўскай вытворчасці. Памер яе — дзевяць на чатыры міліметры, і на гэтай мікраскапічнай плошчы змешчаны перакладзеныя на пяць еўрапейскіх моў выказванні Пушкіна і Горкага аб кнізе, ёсць і графічныя выявы аўтараў. З апошніх дасягненняў у гэтай галіне прадстаўлена і нанакніга: пласціначка менш чым пяць міліметраў (0,46 на 0,46), зробленая па ізраільскім праекце 2014 года. На пласціначку нанесены тэкст 26 кніг Новага запавету на грэчаскай мове.

Адны з найцікавейшых выданняў — першыя з тых, што змяшчаюць гербарыі. Так, збор 150 выяў размаляваных ад рукі лекавых раслін 1484 года належаў князям Радзівілам. Крыху пазнейшы гербарый, што змяшчае 765 раслін, — з найбольш поўных і дакладных свайго часу, належаў пяру аднаго з польскіх медыкаў-даследчыкаў, прафесара медыцыны Кракаўскага ўніверсітэта Сімона Сірэніуса. Па гэтых прыкладах можна скласці ўяўленне пра медычныя веды нашых папярэднікаў і тагачасны стан медыцыны.

Можна пабачыць на выстаўцы і таямнічыя сярод найбольш каштоўных з бібліятэчных фондаў.

Галоўная кніжніца краіны валодае адной з найбуйнейшых у Беларусі калекцый рукапіснай кірылічнай кнігі. Так, найбольш раннія з бібліятэчных фондаў датуюцца канцом XV стагоддзя. На вітрыне прадстаўлены рарытэты з апошніх набыткаў, сярод іх — «Пролаг. Вераснёўская палова» 90-х гадоў XV стагоддзя, напісаны ўстаўным почыркам з характэрным для рукапіснай кнігі афармленнем: ініцыяламі, дзе буквіцы ўпісаны чырвоным; прысутнічаюць назвы раздзелаў і тэкст пададзены на два слупкі. Асобнік унікальны тым, што мае ўладальніцкі запіс, добра відаць кніжны аклад: дошкі і скура, а таксама дзве зашпількі.

Арабаграфічныя рукапісы беларускіх татараў на старажытна-беларускай і польскай мовах, створаныя ў XIX стагоддзі, даюць уяўленне пра ўнікальную культурную з'яву, характэрную для айчыннай гісторыі. На вітрыне — святая кніга Кітаб, створаная ў Докшыцах у 1888 годзе.

Адметнай для Беларусі з'явай была і стараверская, ці старажытніцкая, кніга. У фондзе кніжніцы — выдатная калекцыя богаслужбовых музычных зборнікаў (а сёння яна выступае яскравым аздабленнем выстаўкі). Яны даюць мажлівасць пабачыць своеасаблівы старажытны спосаб фіксавання мелодыі, калі адсутнічаюць лінейкі нотнага стана, а мелодыя зашыфраваная: запісаны ў выглядзе кручковых нот невялікі фрагмент павінен нагадаць добра знаёмую мелодыю. Чырвонымі кручкамі, так званымі шайдураўскімі пазнакамі, адлюстроўвалі вышыню гучання.

— Але для сучаснага даследчыка праблема ў тым, што, калі мелодыю не ведаеш, узнавіць яе практычна немагчыма, — распавядала падчас экскурсіі Марыя Шопіна, загадчык навукова-даследчага аддзела кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Адметнасць афармлення старажытніцкай кнігі ў тым, што ілюстрацыі рабіліся надзвычай яркімі фарбамі з частым выкарыстаннем пазалоты. Да сярэдзіны XX стагоддзя старажытніцы не мелі магчымасці друкаваць кнігу — стваралі рукапісную. Затое, акрамя музычнай традыцыі, яны захавалі і найбольш старажытныя тэксты.

Частка экспанатаў — з рукапіснай спадчыны на ўсходніх мовах: арабскай, турэцкай і персідскай. Бібліятэчная калекцыя налічвае каля сарака асобнікаў. Шэраг рукапісаў — з уласнай бібліятэкі князя Паскевіча, з яго пазнакамі. Адметнасць усходняга атрыманта: у адрозненне ад айчыннага, які мае карычневае адценне, ён вугальна-чорны, яскравы, быццам напісана было чым рабіў яго падобным на сумачку. А на шырокіх палях часам рабілася столькі пазнак, што яны маглі ўтвараць асобны тэкст. Гэта прадэманстравана за шклом вітрыны.

Асаблівую цікавасць на выстаўцы ўяўляюць выданні 1440-х гадоў, з першых работ Гутэнберга. Так, бібліятэка валодае адной з найбуйнейшых і найбольш якасных калекцый першых заходнееўрапейскіх першадрукаў. Прадстаўлены Германія, Швейцарыя, Францыя. Сярод экспанатаў — і асобнік, надрукаваны Антонам Кобергерам, найбольш паспяховым выдаўцом Германіі. Кніга падобна на рукапісную, ад рукі ўпісаны ініцыялы, афармлена залатой фольгай 24 караты. Няма звыклага для нас зместу, але, каб добра ў кнізе арыентавацца, у пачатку главы ўклейваліся скураныя закладачкі. Не прадугледжваўся і тытульны аркуш, і толькі ў канцы на адваротным лістку выдаўцы часам пазначалі месца і год выдання. Прадстаўлены асобнік з Базэльскай друкарні — з тых, што экспануюцца рэдка.

Гербарый. Майнц, 1484 г.

У тэксце — гравюра з выявай Амвросія Медыяланскага. Аўтарам яе, лічыцца, мог быць Дзюрэр альбо вучні яго школы. Упрыгожвае вітрыну і ўнікальны асобнік «Боскай камедыі» Дантэ Аліг'еры, надрукаваны ў 1481 годзе ў Фларэнцыі, родным горадзе аўтара. У асобніку — некалькі гравіраваных выяў — работы Сандра Бацічэлі, гэта адно з першых прымяненняў адбіткаў медных пласцін. Медыярыты ўвойдуць у друкарскую практыку толькі ў XVI стагоддзі.

Адмысловыя выданні, побач з якімі можна доўга стаяць, уяўляючы постаць нашага першадрукара, — скарынаўскія палеатыпы. Нацыянальная бібліятэка Беларусі — адзіная ў краіне захавальніца 10 асобнікаў, выдадзеных у Празе. Арыгінал з добра чытэльным тэкстам на паперы выдатнай якасці, у тэксце — прабелы паміж словамі, максімальна прыбраны

«Птушкі Амерыкі» Джэймса Адзюбона, факсімільнае выданне 1972 г.

выданні, такія як «Брусаў каляндар», па якім, лічылася, можна прадказваць і надвор'е, і будучыя падзеі. Яшчэ з рарытэтаў — «Рука багаслоўя», альбо, іншымі словамі, «год у руцэ» — спосаб па дзвюх руках падлічыць пасхаліі. На пальцах і паміж імі багата пазнак дзён тыдня, выведзены колы сонца і месяца. Пад вокладкай кнігі — і варажбова-прадказальныя артыкулы.

Налічвае бібліятэчны фонд рэдкай кнігі і 13 асобнікаў так званага грамадзянскага друку часоў Пятра I, з прымяненнем распрацаванага Ільёй Капіевічам алфавіта. Сярод іх — «Правіла аб пяці чынах архітэктуры»; адзін з першых жаночых часопісаў таго часу — санкт-пецярбургскае выданне, дзе прадстаўлена мода, некалькі асветніцкіх артыкулаў, прысвечаных літаратуры і мастацтву, парады для жанчын. Выдавец пазначыў, што выданне мае на мэце спрыяць прыемнаму баўленню часу.

Ёсць сярод калекцыйных выданняў паступленні з Мінскай духоўнай семінарыі, набыткі прыватных калекцыянераў. Сярод іх — кніга Казіміра Семяновіча «Мастацтва артылерыі». Аўтар лічыцца заснавальнікам артылерыі і балістыкі, які дакладна пралічыў магчымасці крылатых ракет. У 1650 годзе выданне пабачыла свет на лацінскай мове, мове тагачаснай навукі, і ў хуткім часе было ператорана на еўрапейскія мовы. Поўную калекцыю перакладаў, багата ілюстраваную, са шматлікімі схемамі набылі для бібліятэкі мецэнаты. З крыніц на гранты па падтрымцы мастацтва і культуры была набыта Грамата Сігізмунда, напісаная ад рукі, з пячаткамі ВКЛ. Выстаўляецца гэтая спадчына надзвычай рэдка.

З сучасных шэдэўраў выстаўкі — кніга мастака Юрася Малыша, даследчыка прымітыўнага мастацтва, маляваных дываноў; сучасны варыянт Бібліі Францыска Скарыны з паперы ручной адліўкі, зробленая на дакладнай імітацыі друкарскага станка XVI стагоддзя з гравіраваных пласцін; факсімільнае ўзнаўленне буквара з Еўя 1618 года…

…Цяпер, калі мноства кніг спраўджаюць чалавека ад самага нараджэння ў выглядзе выданняў з яркімі прыгожымі малюнкамі, падручнікаў і энцыклапедый на паліцах ва ўласным доме, навучальных установах, офісах і бібліятэках, цяжка ўявіць, якой каштоўнасцю, даступнай далёка не кожнаму, было чытанне ў даўнія часы. Выстаўка, падрыхтаваная навукова-даследчым аддзелам кнігазнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, стварае ўяўленне пра тое, як моцна, няўхільна імкнуліся да ведаў нашы папярэднікі…

Яна БУДОВІЧ,
фота аўтара

«Пятрылава… Ідуць доўгія дажджы…»

14 чэрвеня 2022 года — гадавіна, як пайшоў з жыцця празаік, драматург Леанід Кірэевіч Левановіч… Нараджэннем з верасня 1938 года, ён прыйшоў у літаратуру з журналістыкі. Спярша закончыў Магілёўскае культасветвучылішча. Працаваў на Дзяржыншчыне, у Касцюковіцкім раёне і саміх Касцюковічах. А ў 1958—1961 гг. служыў на Балтыйскім флоце. Працягваў завочнае навучанне на факультэце журналістыкі БДУ, куды паступіў яшчэ ў 1957 годзе. А як звольніўся са службы, перавёўся на стацыянар. Закончыўшы вучобу, працаваў у газетах «Знамя юности», «Сельская газета». Першыя апавяданні надрукаваў у газетах — «Советской Белоруссии», «Сельской газете».



Фота Кастуся Дробава.

Леанід Левановіч.

У першай палове 1990-х, вярнуўшыся ў Беларусь, я служыў спярша ў Мінскім агульнавайсковым ваенна-палітычным вучылішчы — адказным сакратаром вучылішчнай шматтыражкі, затым — у газеце Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь «Во славу Родины» (зараз — «Белорусская военная газета») — карэспандэнтам, начальнікам аддзела. У гэты час і адбылося маё знаёмства з творчасцю Леаніда Кірэевіча… Першая з прачытаных кніг — «Якорь надежды». Выдадзеная ў Маскве, яна трапіла да мяне раней, чым беларускія кнігі публіцыста і празаіка. На зборнік напісаў невялікую рэцэнзію ў ваенную газету… Так завязалася знаёмства. Стараючыся асвятляць літаратурнае жыццё, час ад часу забягаў і ў «Мастацкую літаратуру», дзе тады працаваў Леанід Кірэевіч. Былі і іншыя сустрэчы з пісьменнікам.

Увесь час, яшчэ са школьных гадоў, збіраю матэрыялы па літаратурнай гісторыі Пухавіцкага краю. Распытваў і ў Леаніда Кірэевіча пра пісьменнікаў-землякоў, пра яго паездкі ў Пухавіцкі раён. Відаць, было і ліставанне ў тыя гады, у 1990-я… Але захаваліся ў хатнім архіве ўжо пазнейшыя лісты ад Леаніда Левановіча. І хаця іх характар даволі дзелавы, канкрэтны, звязаны з пэўнымі клопатамі, у пісьмах усё ж — і характар пісьменніка, яго жаданні і памкненні, яго кароткія развагі пра сваю творчасць, адпаведна — і пра наш час.

27 лістапада 2004 г. Леанід Кірэевіч напісаў мне з вёскі Пятрылава, што ў Вілейскім раёне. Тут ён знайшоў свой прытулак як сапраўдны вясковец. Бо родная магілёўская вёска трапіла пад чарнобыльскую навалу, была адселена…

«Дарагі Алесь!

Адказваю на твой ліст. А. Пісьмянкоў гасцяваў у Пятрылаве 20—21 верасня 2003 г., віншаваў мяне з 65-годдзем. На аўтографе верша — дата 20.IX.2003. 21-га — у нядзелю мы схадзілі ў грыбы, трохі назбіралі. У Мінск ён паехаў з маім зяцем Сяргеем, які і прывёз яго.

На Пухавіччыну, на дзень нараджэння Чыгрынава, ездзіў, здаецца, у снежні 1999-га. Вазіў нас — Людмілу Прохараўну, Пісьмянкова і мяне, — на сваім "Жыгулёнку" В. Белахвосцік, нар. артыст Беларусі. Выступалі ў школе ў Рудзенску. Белахвосцік хораша прачытаў на памяць раздзел з "Плача перапёлкі".

Узгадаў, што ездзіў і яшчэ (ад'язджалі ад Фонду культуры), выступалі ў Пухавічах, гады два таму.

Пра земляка Чыгрынава я напісаў кароткія ўспаміны, якія друкаваліся ў часопісе "Крыніца". Наконт сёлетняй паездкі — не ведаю, ці здасца…» У Мар'інай Горцы многія гады запар арганізатарам Чыгрынаўскіх чытанняў выступаў дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея Аляксандр Прановіч. Чалавек рупліві, ён прыцягваў да восеньскіх сустрэч у знак памяці пра народнага пісьменніка Беларусі Івана Чыгрынава блізкіх яму літаратараў, грамадскіх дзеячаў, блізкіх сяброў… «Наконт сёлетняй паездкі, — піша Леанід Кірэевіч, — не ведаю. Занесена снегам маё Пятрылава, ды і ціск апошнім часам надта скача.

Між іншым, мы з І. Ч. — дзеці адселеных вёсак. Мае Клеявічы, як і ягоны Вялікі Бор, знішчыў Чарнобыль. Я знайшоў прытулак на Вілейшчыне, а ён парадніўся з Пухаўшчынай. Дарэчы, за Вялікім Борам — вёска Мокрае, радзіма Масея Сяднёва. Таго лёс загнаў ажно ў Амерыку. Ён наведаў Мокрае, калі жыхары ўжо былі адселеныя. М. С. — прататып чыгрынаўскага Масея. Асабліва гэты вобраз удаўся аўтару ў рамане "Вяртанне да віны".

Калі надумаешся прыехаць у П. — аўтобус Мінск — Лоўчавічы, 18.30 з Цэнтр. вакзала, білет можна браць да в. Загорцы — 4 км пераедзеш, ад шыльды Вілейскі р-н — 2 км, або да Забр'я — 1 км не даедзеш. Я сустрэну, пераначуеш, а потым мог бы з'ездзіць у Іллю — гэта вельмі цікавае мястэчка. Старшыня с/с Кутас Галіна Віктараўна стварыла ансамбль "Імпэт", сама піша музыку. У Ільянскай школе ёсць музей "Вілейшчына літаратурная", яго дырэктар — Роза Канст. Шэрая. Па яе просьбе і я даслаў сёе-тое, але, на жаль, мы яшчэ не знаёмыя.

Бывай здаровы, Алесь!

Твой Л. Левановіч.

P. S. Я планую паездку ў Іллю па вясне, калі выйдзе кніга».

29 снежня 2004 атрымліваю ліст ізноў з Вілейшчыны, якая была для пісьменніка месцам натхнення, прасторай шчыравання за пісьмовым сталом, — «Слаўная вёска Пятрылава».

«Дарагі Алесь!

Віншую з Новым годам, моцнага табе здароўя, натхнення, плёну ў працы, шчасця і радасці ў жыцці.

21 снежня быў на вечарыне Чыгрынава ў Музеі гісторыі літаратуры. Тэлефанаваў табе на працу, але не злавіў — мусіць, быў у ад'ездзе. Было нас няшмат, гаварылі падоўгу, а мяне ўвесь час не пакідала думка: хіба ў такой зале трэба адзначаць юбілей народнага пісьменніка?! Гэта трэба рабіць на дзяржаўным узроўні. Чыгрынаў варты такой увагі і пашаны.

Мне хацелася сустрэцца з табой, але дужа мала было часу: атрымаўся, так бы мовіць, збег зычных — у "Мастацкай літаратуры" далі чытаць карэктуру "Сіняга лета", абяцаюць у першым квартале 2005 г. выдаць кнігу (у "Полымі" раман быў надрукаваны яшчэ ў 1998 г.). А, па-другое, Казімір Камейша прачытаў новы раман "Палыновы вецер", які "Полымя" плануе надрукаваць у 3—4 нумарах, у яго ўзніклі некаторыя заўвагі, а галоўная "заўвага": трэба скарачаць. Цесна. Ды і пабойваюцца некаторых момантаў: раман пра 1991 г. <…>

Андрэй Федарэнка, які прачытаў раман да свайго пераходу на кінастудыю, кажа: выдатнейшы раман! На жаль, у часопісным варыянце ён гэткім не будзе. Сумна, але што зробіш.

На жаль, няма ў мяне здымкаў Г. Кляўко, хоць і сядзелі мы побач: ён быў намеснікам галоўнага, а я адказным сакратаром. Праўда, я вытрымаў усяго восем месяцаў, бо галоўны <…> быў вялікім самадурам. Хай яму пухам зямля, як і Генадзю Кляўко.

Беражы, браце, здароўе! Абдымаю! Л. Левановіч…»

Наступны ліст ад 4 ліпеня 2006 г. Я ўсё яшчэ працаваў у газеце «Советская Белоруссия» і, вандруючы як уласны карэспандэнт па Мінскай вобласці, меркаваў усё ж зазірнуць у Пятрылава…

«Дарагі Алесь!

На гэты раз я трохі затрымаўся з адказам. Вясковыя клопаты, а найболей — пчалярскія, забіраюць час і сілы. Дый наехала гасцей "з розных валасцей". Госці — гэта малодшая дачка Вольга з унукам Міколам з Бостана — пра іх шмат у кнізе "Усмешлівая Амерыка", якую я табе яшчэ не прэзентаваў, — будзе! І мінскіх гасцей хапае.

Кніга "Хлеб і мужнасць" — вынік 4 вандровак у Казахстан, дзе жылі мае стар. сястра і ст. брат з сем'ямі. Ведаў многіх каз. пісьменнікаў, сябрую з празаікам і драматургам Дулам Ісабекавым. Ён быў у мяне ў Мінску і нават у Пятрылаве. "Хлеб і мужнасць" — журналісцкая праца пра землякоў на цаліне. Дарэчы, "Якар надзеі" — пра беларуса на флоце, "Валанцёр свабоды" — пра беларуса ў Аргенціне, Іспаніі і Францыі — дзе я ніколі не быў, таму пісалася цяжка. Гэтыя кнігі не маглі вызначацца асаблівай глыбінёй, яны цікавыя зместам і формаю: "Якар надзеі" — аповесць у пісьмах, "Валанцёр свабоды" — аповесць-маналог ад першай асобы.

А знайшоў я сябе на радзіме, там, дзе Бесядзь-рака. Мае раманы — гэта лепшае, што мне ўдалося пакуль зрабіць. Таму асабліва цікавіць твая думка пра іх. Што ты думаеш пра ўстаўкі-хронікі? На мой погляд, яны даюць падсветку падзей жыцця ў глыбіннай вёсцы Хатынічы, у далёкім райцэнтры.

Увогуле, пра ўсё гэта трэба гаварыць пры сустрэчы. Як буду ў горадзе, патэлефаную.

Плёну табе ў працы!

Абдымаю!

Л. Левановіч».

20 мая 2008 г. — ліст таксама з Пятрылава…

«Дарагі Алесь Мікалаевіч!

Пішу з вёскі Пятрылава, дзе магутна цвітуць сады, ідуць доўгія дажджы, пад раніцу выскокваюць маразы, звонка цёхкаюць салоўкі, дзе багата гаспадарчых — на жаль, іх нашмат болей, чым творчых, клопатаў. Нядаўна пасадзілі бульбу, а цяпер думаю, як пасеяць грэчку. Рыхтую насенне — праз друшляк прасейваю ад пустазелля, і прасеяць трэба пудоў пяць-шэсць. Вось якія клопаты!

Цяпер пра "Палыновы вецер". Землякі, касцюкоўцы, абяцаюць заказаць, як і "Бесядзь…" — 250 экз.

г. Касцюковічы, Магілёўская вобл. 213 640, старшыня райвыканкама Барысаў Міхаіл Рыгоравіч, тэл.<…>

Вяду перамовы з Крычавам. Не ведаю, хто старшыня РВК у Хойніках: у кнізе апісваецца жыццё ў радыяцыйнай зоне, плюс эсэ пра Ул. Гардзеенку, які родам з Хойніцкага раёна. А можа, Вы праз аблвыканкам дзейнічаеце, магчыма, гэта больш эфектыўна.

Каля 150 экз. могуць узяць лясгасы, вяду перамовы. Каля ста асобнікаў вазьму я — з ганарару.

Учора слухаў тваё выступленне па радыё — гэта важная справа, людзі чуюць жывы голас пісьменніка, на выдатнай, прыгожай, роднай мове. У нядзелю, 18 мая, я таксама гутарыў з Галінай Шаблінскай — перадача "Літаратурная карта Беларусі", гаварыў пра землякоў-касцюкоўцаў. А гэта магутны куст: Куляшоў, Чыгрынаў, Масей Сяднёў, Русецкі, Хомчанка, Зяма Піваварaў, Алесь Пісьмянкоў, рускамоўныя — драматург Аляксей Сімукоў, прафесар Літінстытута ў Маскве Аляксандр Уласенка. А колькі маладых! Так што будзем сеяць, беларусы!

Абдымаю!

Л. Левановіч…»

Яшчэ адзін ліст — ад 20 мая («траўня») 2011 года.

«Дарагі Алесь Мікалаевіч!

Вясновыя клопаты ды плюс яшчэ радыкуліт — вынік гэтых клопатаў, — прывязалі мяне да вёскі яшчэ мацней, таму пішу Вам ліст.

Прачытаў у "ЛіМе" нататку пра выхад у свет кнігі Абая ў перакладзе М. Мятліцкага, і ўзгадалася наша размова на вечарыне Абая ў музеі Якуба Коласа. Гаварылі мы тады, што варта перавыдаць маю кнігу пра беларусаў-цаліннікаў "Хлеб і мужнасць". Пасол Смірноў мяне добра ведае: я працую ў таварыстве "Беларусь — Казахстан" больш як 20 гадоў, быў старшынёй, зараз нам. старшыні.

У кнізе — дакументальная аповесць, нарысы. Пішу не толькі пра людзей, але і пра тое, як пласкарэз, бясплужная апрацоўка глебы выратавалі здароўе цаліны. Аб укараненні гэтай сістэмы яшчэ ў 80-я гады я выступаў па тэлебачанні, радыё, пісаў у "Звяздзе", "Советской Белоруссии", "Сельской газете". Пласкарэз узялі на ўзбраенне некаторыя калгасы Гомельшчыны. Зараз у "Бел. Ниве" пішуць, што бясплужная апрацоўка зямлі сябе апраўдала, яна павышае ўрадлівасць, вынішчае пустазелле, эканоміць паліва, метал, час. За полем без плуга будучыня. Гэтую будучыню трэба рашуча набліжаць.

Пішу ў кнізе пра сустрэчы з выдатнымі казахскімі пісьменнікамі: Абдзіжамілам Нурпеісавым, Адзіем Шарыпавым, Серкам Кірабаевым і інш. Пра беларуска-казахскія літаратурныя і культурныя сувязі. Лічу, што варта ўключаць у кнігу апавяданні, а менавіта: "Вечар у Какчэтаве", "Метро" (друк. часопіс "Простор"), "Казіно", "Серыял" (час. "Наш современник"), а таксама іншыя.

Мне здаецца, кнігу лепш выдаць на рускай мове. Меней чым праз тры гады мы будзем адзначаць 60-гадовы юбілей пачатку асваення цаліны. Кніга можа пайсці і ў Расію, і ў Казахстан. Апавяданні я пераклаў сам, а вось нарысы мог бы перакласці хто іншы. Дарэчы, некаторыя нарысы з кнігі можна апусціць, затое варта ўключыць эсэ "Стогнуць чырвоныя дрэвы" — пра мастака Ул. Гардзеенку, пра Чарнобыль. Твор друкаваў час. "Полымя", эсэ "Самародак" — пра Масея Сяднёва (друкавалася ў час. "Маладосць"). Рэдакцыя "Нёмана" заказала яго пераклад Ірыне Качатковай, пераклад яна зрабіла выдатны, але эсэ пакуль што не публікавалася ў "Нёмане".

Перакласці нарысы мог б нехта з былых "нёманцаў", да прыкладу, ГенадзьАнуфрыеў, Мікола Багадзяж. Памер кнігі каля 20 аркушаў… <…> Шчыра Ваш Л. Левановіч».

Лісты з Пятрылава — і памяць пра Леаніда Левановіча, і размова пра еднасць беларускага пісьменніка з вясковым жыццём… Хуткабежны час штурхае да забыцця… Успомніўшы, нагадаўшы пра імёны і творы, можа быць, мы паспрачаемся і з хуткаплыннасцю, і з разбуральнасцю?!.

Алесь КАРЛЮКЕВІЧ

Сувязь, пераемнасць, майстэрства

Выстаўка работ выпускнікоў Мінскага дзяржаўнага мастацкага каледжа імя Аляксея Канстанцінавіча Глебава «Ступені майстэрства», прысвечаная 75-годдзю навучальнай установы і 120-годдзю з дня нараджэння народнага мастака БССР, праходзіць у Нацыянальным мастацкім музеі і будзе доўжыцца да 24 ліпеня. Куратарам выступіў Аляксей Мацюшонак, навуковы супрацоўнік выставачнага аддзела НММ.

Мінскае мастацкае вучылішча (назва каледжа да 2011 года) стала для многіх знакамітых мастакоў першай прыступкай на прафесійным шляху. Тут першыя прафесійныя крокі рабілі Міхаіл Савіцкі, Май Данцыг, Віктар Грамыка, Арлен Кашкурэвіч, Леанід Шчамялёў, Георгій Паплаўскі, Васіль Шаранговіч, Іван Міско… У экспазіцыі прадстаўлена больш за 50 работ выпускнікоў каледжа ў такіх відах выяўленчага мастацтва, як жывапіс, графіка, скульптура і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Трэба заўважыць, што многія імёны могуць быць невядомыя шырокай аўдыторыі, і гэтым выстаўка ўнікальная. Між тым абсалютная большасць твораў — сапраўдная ілюстрацыя такіх паняццяў, як «пераемнасць традыцый» і «сувязь часоў». На гэтыя тэмы і паразважаем далей.

Аднак спярша звернем увагу на карціну, якая заняла цэнтральнае месца ў экспазіцыі, — «Цёплы вечар» (1963) Андрэя Валатовіча. Гэта выява працаўнікоў-земляробаў. Жанчыны басаном утыкаюць у зямлю чаранкі. Глядач не бачыць іх твараў, у вочы кідаюцца найперш рознакаляровыя хусткі і спадніцы. На другім плане — ужо не ў такім яркім адзенні араты. Акцэнт зроблены на колеры яго твару — ужо добра загарэлага, залітага сонцам, які ледзь не супадае з масцю каня. Герояў на палатне шмат, аднак не яны захопліваюць увагу, бо галоўны тут — рух, які адчуваецца ў кожнай дэталі, у тым ліку ў яшчэ кволых чаранках, якія, здаецца, вось-вось упадуць і згінуць. Твор вылучаецца не зусім традыцыйнай кампазіцыяй, крыху нязвыклым асяроддзем: людзей нібы захінаюць стваламі і галінамі дрэвы. У полі зроку мастака — толькі працаўнікі і зямля, усаджаная дрэвамі, лісце якіх тут замяняе неба. Адлюстравання самой сіні ці чырвані вячэрняга неба мастак наўмысна пазбег. Здаецца, карціна створана ў адпаведнасці з духам часу, аднак уласцівая ёй самабытнасць не страцілася праз шмат гадоў.

Што датычыцца першай тэмы — пераемнасці традыцый, то адзін з ключавых твораў тут — «Ніці» (2019) Марыі Мазурэнкі. Тлумачэнняў гэтай карціны можна прапанаваць некалькі, і ледзь не ўсе яны будуць да месца, але самая першая і відавочная асацыяцыя, якая ўзнікае пры знаёмстве з двухмернай выявай, — старонка з міфалогіі Старажытнай Грэцыі, у сусвеце якой існавалі багіні лёсу. Уяўляліся яны ў вобразе суровых старых: Лахесіс з меркай або вагамі, Клота з верацяном у руцэ, Атрапас з кнігай жыцця і нажніцамі — разрыў ніткі азначаў смерць. У выпадку з «Ніцямі» Марыі Мазурэнкі прысутнічае шмат дэталяў з вышэйапісанага, аднак аўтарам падкрэсліваецца і хрысціянскі падтэкст: адзін з узроўняў карціны адлюстроўвае крыж. Ідэйна вельмі блізкае гэтай рабоце палатно «Ніці лёсу» (2009) Святланы Баевай, толькі тут у большай ступені адчуваецца немінучасць і неабходнасць пакорнасці.

Пераемнасці традыцый прысвечаны і твор пад назвай «Свята» (1989) Таццяны Гучак, што складаецца з мноства вобразаў-сімвалаў. Усе яны, даволі ўмоўныя і максімальна абагульненыя, абазначаюць асаблівую падзею, якая, між іншым, характарызуецца шматзначнасцю, увасабляе аўтарскую ідэю. Падобныя сэнсы нясе ў сабе і трыпціх Кацярыны Трапезнікавай «Народныя святы» (1998). Пэўным чынам ён аб'ядноўвае ў сабе ідэі папярэдніх твораў, перадаючы спрадвечную радасць ад здзейсненага і адлюстроўваючы вобразы жанчын прыгожых, гордых, гарманічных. Побач з ім у экспазіцыі знаходзіцца твор Алёны Сяргеевай «Гульня. Чорнае. Белае» (2010), здаецца, падобны тэматычна, хоць і не зусім блізкі па гучанні.

У гэтай сувязі нельга не згадаць і такія карціны, як «Юр'еў дзень» (2004) Аляксандра Ясюкайця і «Дзяды» (2012) Мікалая Бацяноўскага. У першым выпадку, калі не звяртаць увагу на назву, перад гледачом — традыцыйны пейзаж, у якім час, хоць прыблізна, атрымліваецца распазнаць толькі па вопратцы гераінь. І толькі пасля атаясамлівання з назвай можна асэнсаваць адлюстраванае. Вядома, што з Юр'ем звязваўся першы выпас жывёлы. У гэты дзень сяляне выходзілі з песнямі і ахвярнымі стравамі аглядаць свае палеткі. Усё гэта і складае «Юр'еў дзень» Аляксандра Ясюкайця. Што да другога твора, тут пытанняў не паўстае. Магчыма, для многіх мастакоў тэму сувязі з продкамі не так складана перадаць у жывапісе. Выстаўка «Ступені майстэрства» гэта дакладна пацвярджае, і найперш такімі работамі, як «Цені продкаў» (2006) Таццяны Залатар, «Радавод» (2004) Кацярыны Косаравай, «Бабуліны рэчы» (2018) Алёны Шмідавай, «Азяроды» (1998) Антаніны Слабодчыкавай. Аўтары — абсалютна розныя з адметным творчым почыркам, з розным успрыманнем вобразнасці.

Анастасія Матусевіч «Верхні горад», 2019 г.

Фота аўтара.

Сцяпан Грабчыкаў «Дзяцінства», 2019 г.

І тут пераходзім да другой тэмы — сувязі часоў (хоць, калі пералічыла некаторыя творы, якія па-рознаму расказваюць пра пераемнасць традыцый, у мяне ўзніклі сумненні, ці патрэбна было ўвогуле раздзяляць гэтыя кірункі — настолькі яны ўзаемазвязаныя). Адметна пра гэта выказалася ўжо згаданая Кацярына Косарава, якая з дапамогай «напластавання» стварае некалькі паралельных сусветаў.

Вельмі яркая карціна — «Сямейнае свята» (1964) Міхаіла Рагалевіча. У гэтым выпадку глядач становіцца ўдзельнікам, мабыць, зусім неспадзяванага застолля тыповай беларускай сям'і тых гадоў: спявае бабуля, астатнія героі ў задуменнасці. На першым плане — жанчына з грудным дзіцем, з якога не зводзіць вачэй мужчына ў яркай чырвонай кашулі (гэты прадмет становіцца цэнтрам усёй кампазіцыі), паза іншымі героямі — самотная цяжарная жанчына. На стале, накрытым чорным абрусам, стаяць бутэлька, бакалы, шклянкі, закускі амаль няма. Цікава Міхаіл Рагалевіч супастаўляе колеры — яркія, насычаныя, яны вельмі кантрастуюць з мяккімі і светлымі. Аднак гэты дысананс неабходны для задумы.

Шмат работ прысвечана дзяцінству і сталенню. Сярод іх найпрыкметнейшая — «Дзяцінства» (2019) Сцяпана Грабчыкава, створаная пры дапамозе пап'е-машэ, металу і дрэва. Настолькі своеасабліва паказаць цялеснасць і легкаважнасць новага жыцця і пры ўсім гэтым застацца зразумелым, не абстрактным — сапраўднае майстэрства. Сярод падобных кампазіцый вылучаюцца «Дзверы» (2020) Ганны Макушынскай. Гэта даволі змрочнае палатно, хоць галоўны герой — падлетак. Перад ім адчынена шмат дзвярэй, у якія ён нібыта не хоча нават зазірнуць. Мастачка «схавала» яго вочы, аднак з якой мэтай?

З прасторавай глыбінёй змагла паэксперыментаваць Ганна Біцюк («Кола жыцця», 2007). Сюжэт не патрабуе тлумачэння — назва, выбар колераў, выкарыстаныя вобразы кажуць самі за сябе. Гэтаксама, як і ў выпадку з творамі «У вёсцы» (1985) Аляксандра Барташэвіча, «Двор Івана Андрэевіча» (2010) Юліі Пакінай, «Мой двор» (1977) Маі Каждан, «Двое» (1984) Сяргея Рымашэўскага, «Мы» (2002) Таццяны Логвін. Усе яны адлюстроўваюць адчуванне часу героямі ў пэўным узросце, іх смутак і надзею.

Выстаўка абсалютна не сучасная. Гэта своеасаблівы зрэз эпохі, у якую давялося жыць і стварацца тым ці іншым аўтарам альбо адмысловы зварот да перыяду, які хвалюе, непакоіць, прымушае мастака паказваць яго сваімі вачыма. З гэтай «несучаснасці» вылучаецца адзінае палатно, створанае зусім нядаўна — у 2021 годзе, — «У аб'ектыве» Кацярыны Клачковай. Выява, падобная да сэлфі, звяртае на сябе ўвагу зусім не гэтым. Тут хуткі бессэнсоўнасць партрэта, які нічым не чапляе, грувасткасць гераіні, якую не дапаўняе пэўнае асяроддзе. Здавалася б, таксама сімвал часу, аднак непрыкметны, невыразны.

Між тым у праекце «Ступені майстэрства» пазначаны і кіраўнікі работ, якія ў каледжы сачылі, дапамагалі, падтрымлівалі сваіх навучэнцаў. Так ці інакш, іх уплыў бывае відавочны. Так, нельга не параўнаць К. Клепікаву, М. Мазурэнку, Г. Біцюк, з якімі займалася С. Клепікава. Падобныя асацыяцыі ўзнікаюць і пры найбліжэйшым разглядзе твораў В. Грынь і Н. Нішт (кіраўніком выступіла А. Мурашка). І такіх прыкладаў шмат. Гэта сведчыць усё пра тыя ж пераемнасць традыцый і сувязь часоў, важныя для навучальнай установы, якая ўзгадоўвае новых творцаў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Кацярына Косарава «Радавод», 2004 г.

Таццяна Гучак «Свята», 1989 г.

Уладзімір Трушын «Вечар», 1974 г.

Пасланне Марка

Днямі ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў у прасторы былога музея па праспекце Незалежнасці, 47 адкрылася выстаўка «Шагал. *La Bible*». Экспазіцыю склалі 64 ілюстрацыі Старога запавету, выкананыя знакамітым ураджэнцам Віцебшчыны ў тэхніцы каляровай літаграфіі, а таксама работы сучасных аўтараў, натхнёныя творчасцю сусветна вядомага мастака. Арганізатарам мерапрыемства выступіла «*FARBA*» — установа, якая прыйшла на змену знаёмай нашым чытачам галерэі «*LIBRA*».

Юлія Церашко «Выкраданне Еўропы», 2019.

Марк Шагал «Майсей са Скрыжалямі Запавета», 1960.

Неразгаданыя тайны

Па словах куратараў праекта, ілюстрацыі да Свяшчэннага Пісання, зробленыя Маркам Шагалам па заказе вядомага французскага выдаўца Амбруаза Валара, займаюць вельмі важнае месца ў творчай спадчыне класіка. Дзеля напісання цыкла творца нават здзейсніў працяглую вандроўку па святых месцах Старога запавету — Палесціне, Сірыі і Егіпце. Да таго ж, каб паспяхова праілюстраваць кнігі Танаха, Шагалу давялося асвойваць новую для яго тэхніку — літаграфіі. Работа над серыяй вялася на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў.

Марк Шагал «Стварэнне свету», 1956.

«Біблейскія матывы чырвонай ніццю праходзяць праз усю творчасць мастака», — даводзіць суправаджальны тэкст да выстаўкі. Зрэшты, у гэтым прызнаваўся і сам Шагал. Так, у сувязі з адкрыццём музея «Біблейскае пасланне» ў Ніцы ў 1973 годзе ён пісаў: «З ранняга дзяцінства я быў зачараваны Бібліяй. Мне заўсёды здавалася і здаецца цяпер, што гэтая кніга з'яўляецца самай вялікай крыніцай паэзіі ўсіх часоў. З даўняй пары я шукаю яе адлюстраванне ў жыцці і мастацтве. Біблія падобна да прыроды, і гэту тайну я спрабую перадаць».

Апошні сказ, прадвызначыўшы экспазіцыю ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў, быў абраны своеасаблівым эпіграфам да яе. І нездарма! Прадстаўленыя на выстаўцы работы, таксама як і Кніга кніг, утрымліваюць нямала таямніц, якія давядзецца разгадваць цікаўным гледачам. Напрыклад, што вы скажаце на тое, што на адной з работ дрэва пазнання дабра і зла вырастае літаральна з галавы самога Шагала? У дэшыфроўцы падобных дэталей традыцыйна дапаможа квэст па экспазіцыі, падрыхтаваны арганізатарамі.

Трэба заўважыць, што выстаўка з падобнай назвай дагэтуль ужо трапляла ў афішы беларускай сталіцы. Так, у 2019 годзе менавіта па ініцыятыве і пры садзейнічанні тады яшчэ маладой галерэі «LIBRA» мінчанам была падорана магчымасць упершыню ўбачыць рэдкія творы знакамітага аўтара. Як і калісьці, у сёлетняй экспазіцыі прадстаўлены літаграфіі на біблейскую тэму, пазычаныя з прыватных калекцый. Верагодна, такім чынам нованароджаная ўстанова нагадвае аб сваіх каранях і намякае на тое, чаго чакаць ад яе далей.

Вымавіць невымоўнае

Ключом да разумення «Біблейскіх пасланняў» (назва біблейскага корпуса твораў Марка Шагала) служыць той факт, што аўтар іх — плоць ад плоці іўдзейскай рэлігійнай традыцыі. Прытрымліванне канонаў іўдаізму прадугледжвае апроч іншага строгую

Паліна Корзун-Фомчанка «Стварэнне», 2022.

забарону на ўсякую фігуратыўную выяву чалавека, жывёліны і тым больш Бога, неабсяжнага і невымоўнага паводле азначэння. Атрымліваецца, вынайдзены Шагалам унікальны напаўдзіцячы стыль стаў для яго адзіным выйсцем, арыгінальным адказам на суровае правіла.

Трэба думаць, працуючы над ілюстрацыямі да Свяшчэннага Пісання, мастак вёў яго палажэннямі ўяўную спрэчку. У гэтых адносінах асабліва цікавай паўстае ілюстрацыя да класічнага касмаганічнага сюжэта «Стварэнне свету». На адной невялікай карціне знайшлося месца ўсяму: умясціліся на ёй і святлы, і рыбы, і птушкі, і жывёлы, і людзі, і анёлы, і, канешне ж, сам Творац. Што гэта, калі не дзёрзкая выхадка ўзгадаванага ў рэлігійнай традыцыі жывапісца, гуллівае падміргванне заўзятым ахоўнікам «закона божага»?

Цікава, што ў сваёй рабоце над Бібліяй не абмінуў Шагал і старонак з запаведзямі, адна з якіх забараняе рабіць падобныя малюнкі. Пры гэтым, ілюструючы Дэкалог, мастак кіруецца не метадам аналогіі, суправаджаючы кожнае з прадпісанняў уласным сюжэтам (падобным шляхам ідзе, напрыклад, Кшыштаф Кеслёўскі у сваім шматсерыйным фільме). Наадварот, запаведзі для яго — гэта ў першую чаргу каменныя скрыжалі і тэкст на іх паверхні. Да таго ж у абход названай забароны вырашаюцца яны вельмі абстрактна, пункцірна.

Сны Шагала

Яшчэ шырэй межы фігуратыўнасці рассоўваюць сучасныя беларускія аўтары, чые работы гэтымі днямі таксама прадстаўлены ў залах Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў. У выставачнай прасторы знайшлося месца і поп-арт-эксперыментам Віктара Лагоўскага, і кубічным экзерсісам Юліі Церашко, і практыкаванням у абстрактным экспрэсіянізме Святланы Варабей, і канцэптуальным выказванням Паліны Корзун-Фомчанкі. Адзін з твораў апошняй аўтаркі, дарэчы сказаць, уступае ў дыялог з шагалаўскім «Стварэннем свету».

Вяртаючыся да віноўніка ўрачыстасці, варта адзначыць, што асобную залу на выстаўцы, арганізаванай галерэяй «*FARBA*», займаюць літаграфіі Марка Шагала, зробленыя ім паводле эскізаў да вітражоў уласнага аўтарства. У 1959 годзе мастак атрымаў прапанову запоўніць вітражамі вокны сінагогі Медыцынскага цэнтра Хадаса ў Іерусаліме. Размешчаная на Іўдзейскіх пагорках сінагога мае чатырохвугольны план і 12 акон па перыметры. Кожнае з іх вырашана ў адным з чатырох колераў — сінім, чырвоным, зялёным і жоўтым.

Марк Шагал «Ісая», 1960.

Для лепшага паглыблення ў атмасферу «саманнага» Усходу і раскрыцця біблейскага кантэксту прагляд экспазіцыі суправаджаецца таямнічай кампазіцыяй духавых, якая мякка разліваецца па прасторы. Акрамя таго, да кожнай з шагалаўскіх работ дадаецца фрагмент біблейскага тэксту, які яна ілюструе, і падрабязнае тлумачэнне. Больш за тое, у адной з залаў наведвальнікаў чакае вялікі тэлеманітор, па якім бесперанку ідуць найцікавейшыя фільмы аб мастаку. І як жа не ўспомніць пра фотазону!

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Цікава ведаць

■ Свяшчэннае Пісанне было для Марка Шагала настольнай кнігай, пачынаючы з малога ўзросту. Дзяцінства мастака наскрозь прасякнута яўрэйскімі духам і традыцыяй. На святы ўсе члены сям'і ішлі ў сінагогу і пасля доўгіх малітваў і песнапенняў прымаліся за ўрачыстую трапезу. Хаця біблейскія сюжэты сустракаліся і ў ранняй творчасці мастака, пазней ён скажа: «Тады я не бачыў Біблію, а толькі марыў аб ёй». Нягледзячы на ўсё гэта, Шагал ніколі не лічыў сябе артадоксам, прызнаючыся нават, што сінагогу не наведвае.

■ Першай работай знакамітага ўраджэнца Віцебшчыны пасля захапляльнай вандроўкі па Блізкім Усходзе сталі менавіта ілюстрацыі да Біблії. На працягу 1930-х і ў першыя пасляваенныя гады мастак стварыў 105 афортаў і серыю малюнкаў гуашшу да Пяцікніжжа, кніг Ісуса Навіна, Суддзяў, прарока Самуіла, Царстваў, а таксама тэкстаў прарокаў Ісаі, Ераміі і Езекііля. Па ўласным прызнанні, тэхнікі друкаванай графікі, якія адкрываюць мастакам магчымасці амаль бясконцага тыражавання іх работ, прываблівалі Шагала з юнацтва.

■ Для таго, каб авалодаць майстэрствам гравюры, творца на самым пачатку 1920-х правёў год у майстэрні вядомага гравёра Германа Штрука ў Германіі. Пад пільным кіраўніцтвам прызнанага майстра Марк Шагал спазнаваў азы глыбокага і высокага друкаў: афорту, сухой іголкі, акватынты і ксілаграфіі. Аднак першыя менавіта літаграфіі (тэхніку часцяком памылкова адносяць да гравюры) у скарбонцы славутага мастака з'явяцца толькі ў 1948 годзе, калі ён выканае заказ на ілюстрацыю чатырох казак чарговага выдання «Тысяча і адной ночы».

■ Марк Шагал доўгі час захапляўся мастацтвам вітража. Пачынаючы з 1950-х гадоў творца актыўна займаўся вытворчасцю ўзорыстых вокнаў для каталіцкіх сабораў, пратэстанцкіх кірхаў і іўдзейскіх сінагог па ўсім свеце. На стварэнне вітражоў для сінагогі ў Іерусаліме ў Шагала пайшло два гады карпатлівай працы. Ён казаў: «Для мяне вітраж — гэта празрыстая перагародка, якая раздзяляе два сэрцы: маё і ўсяго свету. Вітраж павінен быць строгім і жарсным. Гэта нешта, што ўзвышае і бадзёрыць. Ён дае адчуванне святла».

Натапыраная птушка з талентам скульптара

Адбылося гэта ў 20-я гады мінулага стагоддзя ў ВМАТЭМАЙС (ВХУТЕМАС) у Маскве. Так скарочана называюцца Вышэйшыя мастацка-тэхнічныя майстэрні. Спяшаецца неяк на заняткі Вера Мухіна. Раптам з пралёту лесвіцы на яе нехта падае. Ад нечаканасці ўздрыгнула, але хутка прыйшла ў сябе. Усяго нагледзелася, працуючы тут. Толькі і прамовіла: «Які дзіўны чалавек...» і пайшла далей.

Веру Ігнатаўну няма патрэбы прадстаўляць. Яна — аўтар знакамітага манумента «Рабочы і калгасніца», выява якога з'яўляецца эмблемай расійскай кінастудыі «Мосфільм». Хто ж «дзіўны чалавек» — сказаць не лішне. Гэта — таленавіты скульптар Меер Айзенштат, пра якога вядома не так і шмат.

Працаваць на цара? Ніколі!

Нарадзіўся ён у Клецку 6 студзеня 1895 года. Ёсць меркаванні, што бацька яго быў равінам. З-за гэтага і з'яўляўся чалавекам веруючым. У сапраўднасці Бенцыян Айзенштат выкладаў рускую мову. Развёўся, калі сын быў зусім малы, і з сям'ёй не кантактаваў. Гэта паведала жонка Меера Бенцыянавіча вядомы скульптар і графік Арыядна Арант. У 2018 годзе маскоўскае выдавецтва «Кучкова поле» выпусціла кнігу «"Искусство твое никуда не уйдет...": Ариадна Арендт в кругу московских скульпторов. Воспоминания, письма». У ёй ёсць і падраздзел «Меер Айзенштат».

Уражлівы ад нараджэння, ён балюча перажываў ростань бацькоў. Як і тое, што маці прыслужвала сваякам. Заставаўся сам-насам, цікавіўся біблейскімі сказаннямі. Пасля знаёмства з «Песняй песняў» Саламона пачаў пісаць у духу іх вершы. Яўрэйская грамада апекавалася ім. Атрымаўшы адукацыю, уладкаваўся пісарам. Працягвалася гэта нядоўга, бо захацеў стаць акцёрам і паступіў у… рамеснае вучылішча.

Не лагічна? Як сказаць… У адрозненне ад іншых, надта ж непрадказальным быў. І ніяк не мог знайсці адзіны свой бераг. Закончыўшы вучылішча, слясарыў у прадпрымальнікаў. І нечакана вырашыў, што яго прызванне — толькі… скульптура. Аднак пачалася Першая сусветная вайна, прызвалі ў войска. Развозіў на кані розныя дэпешы. Хто ведае, колькі гэта працягвалася б, калі б ні з'явілася нежаданне працаваць на цара. Дэзерціраваў, быў асуджаны на доўгі тэрмін.

На волі апынуўся пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Браў прыватныя ўрокі лепкі і малюнка ў жывапісца і педагога Янкеля Кругеля. Магчыма, і на рабфаку вучыўся, каб атрымаць агульна-адукацыйную падрыхтоўку. А пасля паехаў у Маскву. Скончыўшы рабфак мастацкага профілю пры ВМАТЭМАЙСе (ВХУТЕМАСе), і стаў студэнтам..

Рабочага спісаў з жонкі

Настаўнікамі яго былі скульптары Сяргей Булакоўскі, Барыс Данілаў, Вера Мухіна. У той дзень, калі адбыўся кур'ёз з «палётам», маючы задзірысты характар, не паладзіў з кімсьці са студэнтаў і накінуўся з кулакамі. За бедалагу заступіліся таварышы. Тады Меер на аднаго пайшоў, на другога… Абураныя, яны і скінулі яго з лесвіцы.

Аднак часцей займаўся ў майстэрні Васіля Чайкова. На жаль, створанае ў гэты перыяд, за рэдкім выключэннем, не захавалася. Уяўленне аб творах можна атрымаць толькі па здымках і сведчанні Арыядны Арант, з якой вучыліся разам, а пасля і завялі сям'ю.

Наўрад ці было гэта каханне з першага погляду. Відаць, спачатку праявілася жаночае шкадаванне. Таленавіты, а характар не лепшы. Ды і апрануты як нейкі басяк: «Мне было очень жаль этого человека. Он был одет как нищий, и когда я как-то пригласила его в театр, на нем вельветовая блуза типа толстовки оказалась совсем облезшей. Он получал стипендию и жил на нее, но стал часто приходить занимать у меня деньги». Падтрымлівала, хоць павінен быў аддаць нямала грошай. Пасля завяршэння вучобы ўладкавала на нейкую камунальную кватэру. З'явіліся заказы. З асаблівым натхненнем працаваў над партрэтам аднаго рабочага, які ўсё больш станавіўся падобны на яе. З-за гэтага не крыўдавала. Сама скульптар разумела, што творчы чалавек жыве ў сваім свеце, адрозным ад таго, у якім жывуць іншыя. Не пакрыўдзілася і тады, калі нечакана разышліся.

У 1934 годзе нарадзіўся сын Юрый, а праз два гады трапіла пад трамвай, засталася без ног. Не здалася, тварыла, седзячы ў інваліднай калясцы. Ён жа такі нечаканы паварот лёсу перанесці не змог.

На плячах невялікі трактар

Яго дыпломнай работай стала скульптурная кампазіцыя «Сімфонія завода», задуманая як праект афармлення партала-ўваходу на сталеліцейнае прадпрыемства. Традыцыйныя трыумфальныя вароты, гэтакая ж арка. І нечаканы сюжэтны паварот. Рабочых ліцейнага цэха размясціў на вялізнай шасцярэньцы. Складаныя архітэктурныя і пластычныя сюжэты спалучаны ў адзінае цэлае і ў кампазіцыях «Скульптура ў архітэктуры» і «Фізкультура, ці Прысвячэнне Лукасу Кранаху». У апошняй дзяўчына стаіць на нагрувашчванні розных квадратаў і кубікаў, што нагадваюць антычныя разваліны, Іосіф Чайкоў абурыўся:

— Дзе вы ў прыродзе бачылі падобнае?!

А ён да гэтых квадратаў дадаў новыя, патлумачыўшы:

— Так галіны дрэва разрастаюцца ў розныя бакі.

Фота з сайта nasledie-rus.ru

«Сімфонія завода».

Не менш дзіўным выглядае і прысвячэнне. Лукас Кранах Старэйшы — майстар жывапісных і графічных партрэтаў, жанравых і біблейскіх кампазіцый. А калі добра падумаць, то яно ўсё ж невыпадковае. Ёсць у Кранаха карціна «Крыніца вечнай маладосці». У іншым варыянце — «Фантан». Гэта вяртанне да старадаўняга міфу, паводле якога дзесьці знаходзілася крыніца. Нямоглыя старыя жанчыны, акунуўшыся ў яе, становяцца маладымі і прыгожымі. Меер Бенцыянавіч быў упэўнены, што і фізкультура амалоджвае чалавека.

Захаваўся і эскіз яго скульптуры «Трактарыст», якая задумвалася вышынёй не менш чым два метры. Эскіз жа ўсяго паўметра. Але на плячах трактарыста невялікі трактар. Ды яшчэ з фрагментам узаранага палетку. Таксама сімфонія працы — мірнай, стваральнай.

Заглыбляўся і ў гісторыю, як, напрыклад, у скульптурнай групе «Пугачоў перад суддзямі». Жанр, у якім яна выканана, крытыка назвала «скульптурным лубком». З'ява ў прафесіянальнай скульптуры вельмі рэдкая. Назіраецца тады, калі супастаўляюцца фігуры рознага аб'ёму. У дадзеным выпадку — Емяльяна Пугачова і яго суддзяў.

А цяпер зазірнём у расійскі горад Омск. Дзеля чаго — хутка стане зразумелым.

Як Ленін пацясніў Пушкіна

У Омску, як у многіх гарадах Расійскай Федэрацыі, належным чынам увекавечана памяць Аляксандра Пушкіна. Аднак мог прапісацца ў гэтым горадзе са «сваім» Аляксандрам Сяргеевічам і Меер Айзенштат. Калі ў 1937 годзе ў Савецкім Саюзе шырока адзначалася 100-годдзе з дня смерці Пушкіна, не засталося ўбаку і партыйнае начальства Омска. 10 лютага на плошчы былой Ільінскай царквы, каля сквера, названага Пушкінскім, быў закладзены помнік паэту. У Маскве стварыць яго даручылі Мееру Бенцыянавічу.

Здавалася б, заказ буде выкананы своечасова. Ён падступаўся ўжо да ўвасаблення вобліку Аляксандра Сяргеевіча, працуючы над яго мармурным бюстам. Але сказвалася празмерная патрабавальнасць да сябе. Як і кожны скульптар, быў прывязаны і да п'едэстала. Шматступеньчаты, з нізкай балюстрадай, выкананы омскім архітэктарам Яўгенам Сцяпанавым, яму не спадабаўся як залішне традыцыйны. Нарэшце спыніўся на размяшчэнні п'едэстала з фігурай паэта ў цэнтры карэ, паабапал якога на высокіх слупках ідуць хлопчыкі. Свяцільні, якія яны нясуць над сваімі галовамі, нагадваюць факелы. Пушкін жа — светач рускай паэзіі.

Але знаёмства з гіпсавым варыянтам пераносілася тройчы, а з нападам фашысцкай Германіі стала не да манумента Пушкіну. 20 красавіка 1957 года на гэтым месцы размясцілі Леніна. Дарэчы, гіпсавы помнік паэту быў устаноўлены яшчэ ў 1948 годзе. Старажылы па сёння гэтае месца называюць Пушкінскай горкай.

Касмапаліт — значыць чужы

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Меера Бенцыянавіча па стане здароўя ў войска не мабілізавалі. Пры набліжэнні немцаў да сталіцы баяўся, каб не занялі яе. Ведаў, як фашысты ставяцца да яўрэяў. Знішчыў дакументы, пісьмы. Бяда напаткала пазней...

У яго даўно не склаліся адносіны са скульптарам Яўгенам Вучэчыцам. Іх Арант назвала «ужасными», але чыя віна — не сказала. Прычынай магла стаць, з аднаго боку, няўжыўчывасць Айзенштата. З другога боку, паступова ўсё большая забранзавеласць Яўгена Віктаравіча. Ды і яго стаўленне да «белабілетнікаў». Заяваў добраахвотнікам, чым ганарыўся. Трапіўшы ў акружэнне, вырваўся з яго.

Захацеў забраць майстэрні ў некаторых мастакоў. Калі яны, абурыліся, выхапіў пісталет. Усе анямелі. Толькі Меер Бенцыянавіч падаў голас: «Осторожно, может быть осечка!» Меў на ўвазе «выстрел», але вельмі хвалявaўся. Майстэрню вярнуў толькі ў 1946 годзе. А тут якраз пачалася барацьба з касмапалітамі. Для выжывання браў што-небудзь на заказ. Халтурыць, як пры безграшоўі іншыя, не мог. Гэта зрывала своечасовае выкананне заказаў. Кліентаў станавілася менш.

Не перавяліся і ахвотныя завалодаць яго майстэрняй. Адзін з іх нават пакінуў запіску: «Товарищ Айзенхауэр, или как Вас звать. Я приходил сегодня смотреть Вашу мастерскую, но не застал Вас дома. Она мне все равно нужнее, чем Вам. Вы все равно не работаете. Оставьте ключ у лифтера, я зайду в следующий раз».

Аўтапартрэт — Марабу?

Была і яшчэ адна бяда: ішоў не ў нагу з часам. Калі многія захапляліся авангардам, перавагу аддаваў Мікеланджэла,

Фота з сайта artuzel.com

Меер Айзенштат.

готыцы. Пасля нечакана не толькі ўпадабаў Казіміра Малевіча, але і стаў называць яго сваім настаўнікам. У сапраўднасці яны нават не былі знаёмыя.

Кім не быў абдзелены, дык карыкатурыстамі. Яны ахвотна рабілі на яго шаржы. Звычайна падавалі як натапыраную птушку. Сапраўды, калі добра прыгледзецца, па вострым носе, паднятым каўнеры паліто ён у нечым нагадваў варону. Не крыўдзіўся: хоць нейкая, а рэклама. І сам сябе ў нечым успрымаў птушкай. Толькі не варонай, а марабу. Яна з сямейства буслиных, жыве ў Паўднёвай Азіі, а яшчэ на поўдні Сахары. З арабскай мовы перакладаецца як «мусульманскі багаслоў». Прыхільнікі ісламскай рэлігіі лічаць яе мудрай.

Асобныя крытыкі мяркуюць, што, стварaючы статуэтку «Птушка Марабу», ён, як гэта ні дзіўна, напісаў свой аўтапартрэт. У свой час гэтая статуэтка была такой папулярнай, што Гжэльскі керамічны завод наладзіў яе серыйную вытворчасць. Але найбольш цікава тое, што з «Птушкай Марабу» знаёмы роўна столькі чалавек, колькі з захапленнем глядзелі фільм «Сцеражыся аўтамабіля». Памятаеце, як Дзіму Сяміцветаву, ролю якога выконвае Андрэй Міронаў, надакучыла саркастычнае стаўленне да сябе цесця, падпалкоўніка ў адстаўцы Сокал-Кружкіна? Неяк не вытрымаў, схапіў важкую статуэтку. «Положь птичку», — прагучала з вуснаў Сямёна Васільевіча. На дзіва праўдзіва, пераканаўча, з інтанацыяй, так характэрнай для народнага артыста СССР Анатоля Папанава, які геніяльна ўвасобіў вобраз Сокал-Кружкіна. Гэта тая самая «Птушка Марабу».

Сваёй персанальнай выстаўкі Меер Бенцыянавіч так не дачакаўся. Памёр 11 лістапада 1961 года. Упершыню шырока прадставілі яго творчасць толькі ў 1986 годзе. Яшчэ адна выстаўка была ў 1991-м. Але па-сапраўднаму сваім талентам перад прыхільнікамі мастацтва раскрыўся ў 2015 годзе. У канцы снежня ў Дзяржаўным музеі архітэктуры імя А. В. Шчусева, што ў Маскве, адкрылася выстаўка «Скульптура ў горадзе М: Меер Айзенштат, Наташа і Марыя Арант», прысвечаная 120-годдзю з дня нараджэння скульптара. Так прыйшлі да гледачоў не толькі сам Меер Бенцыянавіч, але і яго ўнучкі — модныя сучасныя мастачкі.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Бараніць харство

Ёсць «лімаўскі» радок і ў біяграфіі вядомага паэта Міхася Калачынскага. Дарэчы, ён таксама быў адказным сакратаром «ЛіМа», але ў даваенны час. Гэтаксама нядоўга — усяго два гады. У 1938 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. Перад адыходам у войска напісаў верш «Вернасць»:

Расставаліся.
Салдацкая дарога
У прасцяг далёкі паплыла.
Ты ў паход мне не дарыла многа —
З ніткаю іголку прынясла.
Я бяру іх,
Будуць неабходны,
Хай на ўсякі выпадак ляжаць.
І я цябе, як песню, ў час паходны,
Буду помніць, буду ўспамінаць.

Традыцыйна проста, шчыра. Толькі ўжо прысутнічае мускульная дакладнасць радка. Хоць, безумоўна, у Міхася Калачынскага і сярод ранніх твораў нямала такіх, якія ў параўнанні з ім па-мастацку больш дасканалыя. Адметна тое, што менавіта гэты верш стаў пачаткам армейскай лірыкі. Праз год, апынуўшыся на савецка-фінскім фронце, на ўласнай скуры адчуў, што такое мароз краіны Суомі, наколькі непрыступная «лінія Манергейма». Тым самым «Вернасць» арганічна ўвабрала ў сябе вопыт мірнага і ваеннага жыцця.

Творы, блізкія па тэматыцы да яе, склалі змест яго першай кнігі «На выбаргскай старане». Аднак яна так і не пабачыла свет. Рукапіс зборніка згарэў у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Балазе, тэксты асобных вершаў у аўтара захаваліся. На падставе іх і сёння, калі мінула столькі гадоў з часу напісання, можна меркаваць, што гэта сапраўды была кніжка, а не проста сабраныя разам творы. Адкрыта даверлівая, хоць і не пазбаўленая юнацкага максімалізму.

Лірычны герой у пэўнай ступені паўстае своеасаблівым апавядальнікам думак і памкненняў маладых прадстаўнікоў свайго пакалення. Аднак не абышлося і без рытарычнасці. Напрыклад, у вершы «Мая прысяга»: «І тады, калі вайна прачнецца, // Растрыбушыць гром цішыню, // Кіну ў полымя я мужнасць сэрца, // Толькі вас ад гора засланю». Ды і верш «Летні дзень» пры ўсёй яго аўтабіяграфічнасці (Міхась Калачынскі служыў у авіяцыі, і сам Міхаіл Калінін у Крамлі ўручаў яму медаль «За баявыя заслугі») псуюць агульныя развагі.

У цэлым жа першая кніга Міхася Калачынскага ўспрымаецца кнігай мужнасці. Асабліва тыя вершы, у якіх на першым не проста ўбачанае, а ўласна перажытае. Народжаныя там, дзе «над возерам Суары паўночны вецер дзьме, // Свет высяваюць хмары данінаю зіме. // Завеі… стынь… сумёты… Трывожны гоман хвой. // Тут Манергейма доты прысыпаны зімой». Як цяжкі ўздых чалавека, падманутага ў найлепшых сваіх спадзяваннях, напісаўся верш «Мы верылі табе, Суомі…» Іншыя творы — «Перабежчык», «Крумкае чорны птах», «Раскуты», «Замёрзлы» — гэта ўжо больш шырокае, аб'ёмнае бачанне таго, што адбывалася.

Але не менш суровыя, а ў нечым і больш страшныя выпрабаванні чакаліся наперадзе. Пачнецца Вялікая Айчынная, і ў вершы «Пусты аэрадром» Міхась Калачынскі прыгадае перажытае: «Я трохі гора паспытаў, // Паспеў пазнацца з ліхам», каб праз колькі радкоў дадаць: «Успомніў фінскую. // Яна // Прэлюдыяй грымела. // Аэрадром пусты… // Вайна // сапраўдная запела».

«Сапраўдная вайна» жыве, сурова дыхае ў дзясятках твораў паэта. Нават па назвах можна здагадацца і пра тое, што хвалявала яго, і пра дарогі, якімі давялося прайсці: «Бежанцы», «Адпраўка», «Тым, хто ідзе на Захад», «За намі — Кубань», «Прарыў», «Плацдарм», «Сустрэча з Венгрыяй, «На мяжы з Баварыяй»… Сярод іх — і вершы, што не губляюцца ў беларускай ваеннай паэзіі. Яны напісаныя не проста сведкам, а актыўным удзельнікам падзей. Хоць у звычайных успамінах пра гэта сведчыў сціпла: «Рэдакцыю машыны праз вайну везлі. Газетчыкі ішлі наперадзе — з пяхотай, танкамі, кавалерыяй. Маладзейшыя, абстраляныя, хто зведаў, пачым фунт ліха, у першым эшалоне знаходзіліся. І мне давялося там быць…»

Ваенныя творы Міхася Калачынскага напоўнены праўдай пярэдняга краю. У іх боль пакут і горыч страт, радасць перамог і сонечнасць надзей. Яны — мастацкі летапіс вайны і ўжо тым значныя ў яго творчасці. Праўда факта і праўда пачуцця зліваецца ў адно цэлае, а лірычны герой раскрываецца як індывідуальнасць, асоба, як чалавек, які ведае сапраўдную цану жыццю.

Лёс з арміяй Міхась Калачынскі звязаў да 1953 года. Гэта, зразумела, не магло не аказаць уплыву на тэматыку яго пасляваенных твораў. Аднак, як і яго калегі, не мог не пісаць пра паўсядзённае жыццё горада і вёскі. І гэтаксама, як ім, яму заўсёды ўдавалася пазбегнуць недахопаў, характэрных для тагачаснай паэзіі: драбнатэм'я, ілюстрацыйнасці, рэпартажнасці, параднасці, калі жаданае выдавалася за рэальнае. Патрэбны быў час, каб і сам зразумеў, што шчырасць, непасрэднаць не прызямляюць верш, не адводзяць ад надзённых праблем часу, а, наадварот, праз асабістае, інтымнае дазваляюць глыбей спасцігнуць і зразумець агульначалавечыя праблемы.

Міхась Калачынскі.

Другое дыханне паэзія Міхася Калачынскага набыла ў сярэдзіне 60-х гадоў мінулага стагоддзя. Лірычны герой зноў паўстаў паўнакроўным і жывым. Кнігі «Сосны і дзюны», «Гронка арабіны», «Паясы», «За палямі, за лясамі» і іншыя — такая паэзія, у якой паядналіся радасць і боль, пяшчота і гнеў, неспакой і трывога. Паэтава сэрца напаўняла жаданне быць не толькі пачутым і зразумелым, але і каб напісанае станавілася ў радасць тым, хто далучаецца да яго.

Важкія набыткі Міхася Калачынскага і ў паэзіі для дзяцей. Найбольшай папулярнасцю з напісанага ім для маленькіх і юных чытачоў крыстаецца паэма «Прыгоды Патапкі», перакладзеная на шэраг моў. Сам таксама паспяхова працаваў у галіне перакладу. Вялікія заслугі Міхася Іванавіча ў выхаванні маладых творчых талентаў. Аб іх рупіўся, і працуючы намеснікам старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аднак асабліва шмат зрабіў у гэтым кірунку, 18 гадоў узначальваючы рэдакцыйны калектыў часопіса «Беларусь».

Ганна ІВАНЕЙ

Залатыя ўрокі жыцця

Літаратурна-музычны вечар памяці віцебскага паэта Барыса Беляжэнкі, прысвечаны 85-годдзю з дня яго нараджэння, правялі Віцебскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі сумесна з Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна і Бачэйкаўскай сельскай бібліятэкай, якая носіць імя паэта.

Горыч яго лёсу была сапраўды вялікая. Паэт упарта лічыў, што ўся яго жыццёвая доля была своеасаблівай «платай бесу», пра што ён нярэдка і недвухсэнсоўна пісаў у вершах. У пачатку свайго шляху, у тым ліку творчага, Барыс Беляжэнка не толькі не верыў у Бога, але і нават быў гарачым багаборцам.

Мы пазнаёміліся каля сарака гадоў таму, і зусім не на літаратурным, а на жыццёвым полі — як суседзі. З маім мужам яны часта пакеплівалі, ды і проста смяяліся з мяне, што вывучала і паглыблялася ў Кнігу Кніг — Свяшчэннае Пісанне. І менавіта Барыс Паўлавіч спрабаваў «разбіць» мае гарачыя і шчырыя перакананні і веру, апелюючы тэкстамі «Пацешнай біблії» (была такая кніга, якая карысталася поспехам у атэістаў, прапагандыстаў і агітатараў таго часу). У нашай няпростай спрэчцы, дзе я адна супрацьстаяла двум сталым мужчынам, перамога была нечаканай для іх. Яе атрымала, вядома ж, Свяшчэннае Пісанне.

Здаецца, менавіта з таго часу, пасля шматлікіх гутарак, абодва мае «апаненты» перагледзелі сваё стаўленне да Бога і веры. Няхай не адразу, але яны пачалі і Біблію пачытваць, і ў царкву прыходзіць, і маліцца, ціхенька адасобіўшыся ў кутку, нібы саромеючыся. Але жаданне маліцца і адкрыць свой смутак і пакуты Богу сталі небходныя… У позняй творчасці Барыса Паўлавіча вельмі прыкметна гучалі ноты веры, шчырага прыняцця Бога... Хоць і не без філасофскага пытання, якое мучыла… А ўсё ж…

Глухая ночь… Зажгу свечу для Бога…
Для Сатаны, чтоб знал он свой предел.
И кочергу поставлю у порога:
А вдруг уже он к дому подлетел.
Сердечком бьется пламечко немое…
Минута эта так мне дорога…
И вновь ребром вопрос передо мною:
Что — Богу свет, что — черту — кочерга?

Барыс Беляжэнка рана даведаўся, што такое раненне, не ў баі, а ў жыцці, атрымаўшы калецтва і страціўшы напалову зрок. Аднак быў вельмі актыўны: пісаў кнігі і, працуючы ў рэдакцыі абласной газеты, мноства інфармацыйных, філасофскіх і грамадска-публіцыстычных матэрыялаў… Апошнім часам працаваў над гістарычнай аповесцю пра вялікага асветніка XVI стагоддзя Васіля Цяпінскага, часопісны варыянт якой быў апублікаваны ў 2014 годзе, за два гады да смерці пісьменніка, у «Нёмане». Але, на жаль, твор так і не быў скончаны…

Слова мае Тамара Краснова-Гусачэнка.

На многія вершы паэта напісаны песні, якія сталі вядомымі і выконваюцца на сцэнах абласных і раённых свят. Асноўнымі тэмамі яго творчасці былі любоў да Радзімы, захапленне яе прыродай, цудоўнымі, працавітымі людзьмі Беларусі. Барыс Паўлавіч імкнуўся працаваць у розных жанрах на беларускай і рускай мовах. Літаратурная і грамадская дзейнасць творцы неаднаразова адзначалася на абласным і рэспубліканскім узроўнях. Быўшы ў складзе Саюза пісьменнікаў з 1979 года, выдаў 13 кніг: «Крыгалом», «Жытнёвае поле», «Крык у ціхай затоцы», «Званочак і цюльпан», «Успаміны пра майго асла»… У іх сабраны найлепшыя яго паэмы, вершы, апавяданні, навелы, гумар, сатыра, афарызмы, выслоўі.

У свой час скончыў філфак БДУ, Мінскую вышэйшую партыйную школу. Як чалавек усебакова развіты і энергічны, цікавіўся моднымі ў той час Цэнтрамі народнай медыцыны ў Маскве і ў Кіеве, вучыўся на шматлікіх курсах, заканчэнне якіх заўсёды з асаблівай гордасцю згадваў ва ўсіх сваіх біяграфіях, і спрабаваў быць паслядоўнікам шырока вядомых у той час Джуны і Кашпіроўскага…

Усе гэтыя захапленні ўплывалі як на бачанне свету, так і на яго творы… Адсюль, мабыць, і «для нячысціка плата», і «таямніца івалгі», і іншыя моманты пошукаў, роспачы і сумневаў, характэрных для сапраўднай творчай асобы. І паэзія аптымістычная, з тонкім гумарам і часам цвёрдай сатырай у канчатковым выніку перамагала ў ім адчуванне адчаю і суму, сумневаў і горычы. Шматлікія выступленні Барыса Паўлавіча ў працоўных калектывах, бібліятэках, дамах культуры, навучальных установах і сярод калег-літаратараў былі заўсёды паспяховыя… Хто толькі не смяяўся ад душы, слухаючы яго байкі «Агуркі», «Дачнік», «Аўтобус» і іншыя… Ён быў вялікім гумарыстам і жыццялюбам, умеў зараджаць пазітывам усіх.

Паэты і празаікі, якія сабраліся на музычна-літаратурным вечары памяці ў дзень 85-годдзя Барыса Паўлавіча, яго сябры Вольга Русілка, Мікалай Намеснікаў, Андрэй Герашчанка, Валянціна Шырынава, Валерый Касаткін, Ірына Радзіхоўская, музыканты і мастакі Віталь Рауза, Алег Кірушкін, Людміла Станкевіч з удзячнасцю і сумам успаміналі паэта, чыталі яго вершы, а музычны народны самадзейны калектыў «Крыніца» сардэчна выканаў яго любімыя народныя песні.

Где ж ты, бабушкина печка
С теплым, ласковым челом?
Где дымков твоих колечки,
Что царили над селом?

У гэтым творы Барыса Беляжэнкі цэлы раман… Тут і «Ціхі Дон», і «Вайна і мір»… У кожнага з нас былі і такая чароўная печка, і бабуля, якая перанесла вайну, на якой страціла і мужа-карміцеля, і сваіх сыноў-дачок, і няма ім ліку, стратам і слёзам. А бабуля стаяла як сцяна сярод жыццёвых завірух і пакут, карміла і гадавала сваіх унукаў, чытала ім несмяротныя казкі Пушкіна, і сярод начной завірухі, холаду і голаду чароўная руская печка саграваля і дапамагала выстаяць нашаму народу… А паэт заўсёды з народам.

Светлая, жывая атмасфера, у якой нібы чуўся вясёлы голас творцы, панавала ў канцэртнай зале абласной бібліятэкі, дзе гучала музыка і словы вершаў Барыса Беляжэнкі, заўсёды такога добразычлівага, чулага, які па-філасофску ставіўся да жыцця і мужна прымаў яго залатыя ўрокі. Доўга яшчэ звінелі ў ясным чэрвеньскім дні светлыя і жыццесцвярджальныя радкі вершаў, пакінутых нам Барысам Беляжэнкам.

Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА
Фота даслана аўтарам

Простыя рэчы

Калі хобі — размаўляць…

Артур Мехціеў — той рэдкі прыклад, калі хобі супадае з прафесіяй. У журналістыцы — з 1997 года, заўсёдны госць найпрэстыжнейшых фестываляў Еўропы: Канскага, Берлінскага, Венецыянскага, «Кінатаўра» і іншых, аўтар ідэі стварэння часопіса «Однако, жизнь!» (разам з А. Казакевічам) і пастаянны вядоўца яго рубрыкі «Званы госць». Самае цікавае, што Артур Мехціеў не вучыўся на журналіста. Скончыўшы Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, працаваў мастацкім кіраўніком, дырэктарам Дома культуры, у турыстычнай фірме… Сёння ён аўтар паэтычных зборнікаў, тэкстаў песень і шматлікіх інтэрв'ю з творчымі асобамі сусветнага маштабу, сам дае інтэрв'ю — распавядае, што яго прывяло ў журналістыку.

Фота з асабістага архіва А. Мехціева.

— Артур, кожны ваш суразмоўца дзеліцца сакрэтамі поспеху. А якія яго складнікі галоўныя для вас?

— Самае галоўнае — любіць справу, якой займаешся. Як часта жартую, я — у шлюбе з маёй работай. І гэта праўда: больш за ўсё часу аддаю ёй. Калі работа прыносіць радасць, задавальненне — то ўжо залог поспеху. Дый у любым узросце чалавек павінен развівацца, вучыцца, не заставацца на адным месцы, ісці наперад, пашыраць кругагляд, чытаць літаратуру. Глядзець інтэлектуальныя праграмы. Мне 57 гадоў, і я стараюся пастаянна самаўдасканальвацца. Нельга ставіць планку: чагосьці значнага дасягнуў — і ўсё…

— А як атрымалася, што вы, не маючы прафесійнай адукацыі, сталі пісаць і актыўна друкавацца?

— Генетыка спрацавала (*смяецца*). Рэч у тым, што мая бабуля па маці, родам з-пад Оршы, была траюраднай сястрой Уладзіміра Караткевіча. Яны сябравалі, хоць бабуля была простай сялянкай. Брат маёй мамы, Эдуард Карніловіч, аўтар каля 10 кніг… У нас былі сяброўскія стасункі, ён пазнаёміў мяне з многімі пісьменнікамі, у тым ліку з Іванам Шамякіным, Нілам Гілевічам, Генадзем Бураўкіным… А вось куды паступаць — асабліва доўга не думаў. Пасля арміі падаў дакументы ў Інстытут культуры, як тады называлася ўстанова, за кампанію з сябрам — трэба было некуды дзецца, каб не марнаваць час…

— Калі згадаць шлях ад таго часу да сёння: дзе быў паварот, які спрыяў таму, што ў вас абудзілася пакліканне журналіста?

— Калі апошнія паўгода арміі служыў пад Масквой, у звальненні пазнаёміўся з сынам найпапулярнейшай тады актрысы Любові Сакаловай — яна занесена ў Кнігу рэкордаў Гінеса як актрыса, якая сыграла найбольшую колькасць роляў. Не ведаў, хто яго бацькі, але калі я сказаў, што любімая актрыса маёй мамы — Любоў Сакалова, ён кажа: «Давай цябе з ёй пазнаёмлю». Так склалася, што пад яе ўплывам я хрысціўся — яна стала маёй хроснай маці… Запрашала мяне з сабой на фестывалі, знаёміла з легендамі кіно. У той жа час як дырэктар Дома культуры, кіраўнік, па абавязках службы знаёміўся з прадстаўнікамі прэсы. Яны мне і прапанавалі зрабіць першыя інтэрв'ю, нават пытанні самі прыдумвалі і давалі дыктафон — я толькі прыязджаў у госці да суразмоўцы, казаў: маўляў, я непрафесіянал, але мяне папрасілі запісаць гутарку. Ніхто не адмаўляў. А потым мне гэта спадабалася.

— Кожнае ваша інтэрв'ю на старонках часопіса суправаджае аўтограф — пажаданне чытачам ад вашага суразмоўцы. Акрамя таго, фота суразмоўцы побач з вамі. На першы погляд не зусім сціпла…

— Пачыналася ўсё ад найлепшых канонаў журналістыкі: ілюстравала мае інтэрв'ю толькі фота суразмоўцы. Але ў кулуарах даводзілася чуць: маўляў, як можна ўзяць інтэрв'ю ў народнага артыста СССР Вячаслава Ціханава? Альбо ў Ланавога — яны ж недасягальныя! Як іх можна дастаць у Мінску?!



Пажаданне для чытачоў «ЛіМа» ад Артура Мехціева.

Відаць, панацягаў са старой прэсы ды выдае за сваё! Мяне гэта зачапіла, таму прыняў рашэнне: у кожнай гутарцы будзе мой здымак з «зоркай» і пажаданне ад яе! Пасля таго больш не даводзілася чуць за спінай падобных разважанняў!

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Сустрэчы з маланкай

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў канала «Культура» Беларускага радыё — праект Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». Радыёверсія яго тэлеперадачы «Суразмоўцы», што гучыць на «Культуры» ў нядзелю і сераду, прапануе сустрэчу з кандыдатам філалагічных навук Янінай Грыневіч.

У рамках блока ранішніх праграм «У рытме дня» выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі і мініяцюрамі беларускіх аўтараў, а таксама «Раніш-ні серыял» з працягам твора Людмілы Рублеўскай «Золата забытых магіл».

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе старонкі рамана Чынгіза Айтматава «Буранны паўстанак» у перакладзе на беларускую мову Міхася Стральцова. У «Радыёбібліятэцы» гучыць твор Эрыха Марыі Рэмарка «Трыумфальная арка». У праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных слухачоў чакаюць апавяданні.

Для аматараў паэзіі ў суботу і нядзелю прагучаць вершы Міколы Аўрамчыка.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць спектаклі «Незамужняя ўдава» паводле аднайменнай аповесці Рамана Сабаленкі і «Маланка ўначы» па аднайменнай аповесці Галіны Васілеўскай.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе з панядзелка да пятніцы ў праекце «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» старонкі твора Янкі Маўра «ТВТ». У суботу і нядзелю перадача «Дзіцячы радыётэатр» — пастаноўкі з фондаў Беларускага радыё. Штовечар у 21.00 для маленькіх выходзіць «Вячэрняя казка».

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

18 чэрвеня — на прэзентацыю кніг пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей. Мерапрыемства пройдзе на плошчы Свабоды (побач з Ратушай) на пляцоўцы дзіцячых бібліятэк сталіцы (з 13.00 да 17.00).

22 чэрвеня — на творчую сустрэчу з паэтам Уладзімірам Мазго ў СШ № 10 (зав. Бранявы, 15) (11.00).

22 чэрвеня — у публічную бібліятэку № 7 (вул. Пляханава, 97, к. 4) на прэзентацыю кнігі Іны Фраловай «Андрэйкава лета» (11.00).

ЛіМ КАЛЯНДАР

19 чэрвеня — 110 гадоў з дня нараджэння Пятра Бітэля (Пятра Іванавіча; 1912—1991), беларускага паэта, перакладчыка.

19 чэрвеня — 110 гадоў з дня нараджэння Вацлава Окалава (1912—1969), беларускага акцёра, заслужанага артыста БССР.

20 чэрвеня — 110 гадоў з дня нараджэння Канстанціна Паплаўскага (1912—1984), беларускага харавога дырыжора, кампазітара, педагога, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

20 чэрвеня — 70-годдзе святкуе Віктар Хмыз (1952), беларускі жывапісец, графік, педагог.

20 чэрвеня — 60-годдзе адзначае Кацярына Дулава (1962), беларускі музыказнавец, грамадскі і палітычны дзеяч.

22 чэрвеня — 85 гадоў з дня нараджэння Барыса Аліфера (1937—2014), беларускага кінааператара, заслужанага дзеяча мастацтваў БССР.

23 чэрвеня — 80-годдзе адзначае Аліса Мароз (1942), беларуская мастачка-акварэліст.

23 чэрвеня — 75 гадоў святкуе Валерый Пазняк, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

24 чэрвеня — 115 гадоў з дня нараджэння Язэпа Зазекі (Іосіфа Васілевіча; 1907—1977), беларускага празаіка, літаратуразнаўцы, фальклярыста.

24 чэрвеня — 95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Крука (1927—2008), беларускага фатографа, фотакарэспандэнта.

25 чэрвеня — 130 гадоў з дня нараджэння Зігмунта Абрамовіча (сцэнічнае імя Антон Забель; 1892—1988), беларускага акцёра.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74
адказны сакратар — 377-99-73
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
16.06.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 675

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 1303

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 22024